Пролетарыі усіх краёў, аб'ядноўцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пайпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пайпарэлі пасярод тэксту 1 р. — к. За радок пайпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожай. Звыш тэрміну бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 • Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 • За кожны дадатковы — 5 • Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 41 (2530) Чацьвер, 21-га лютага 1929 г.

НАВАТ ПАТЭКТАВАНЫ АБАРОНЦА КАПІТАЛІЗМУ ПРЫЗНАЕ НАШЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ.

буржуазная грамадзкасьць даўно расчаравалася ў прароцтвах прадажнае прэсы аб надыходзе крызісу ў СССР.

УРАЖАНЬНІ АЛЬБЭРА ТОМА АД ПАДАРОЖЖА ПА САВЕЦКАМУ САЮЗУ.

ПАРЫЖ. 19-2. Орган сацыялістаў «Популер» зьмяшчае вялікую гутарку з дырэктарам міжнароднага бюро працы пры Лізе Нацый Альбэрам Тома на конт яго ўражаньняў аб Савецкім Саюзе.

Тома заявіў, што ўражаньні яго маюць станоўчы характар. Калі ў Альбэра Тома супрацоўнік газэты запытаў, ці меў ён магчымасьць вольна даведвацца аб становішчы, дык Тома пад крэсьліў, што ён ні на момант не адчуваў нагляду за сабою. Тома апісвае гарадзкое жыцьцё Масквы, заяўляючы што па інтэнсыўнасьці культурнага жыцьця Масква не адрозьніваецца ад эўрапейскіх сталіц.

Далей Тома зазначае, што ён прысутнічаў на Кастрычнікавай дэманстрацыі і пераканаўся, што „ад гэтага натоўпу павявала вялікаю прыхільнасьцю да існуючага рэжыму гэтая прыхільнасьць тлумачыцца тым, што гэты рэжым, гэты лад — яго, натоўпу, уласны лад, што яны гаспадары і што яны вольныя. Адчуваецца, што ўвесь народ напружан у вялічэзным імкненьні узьняцца з руін, пе рамагчы эканамічныя перашкоды, павялічыць прадукцыю. Няма нічога супольнага між гэтым натоўпам і старым гультайскім расейскім натоўпам даваеннага часу. Што датычыць урадавых дзеячоў, дык іх працаздольнасьць і адданасьць справе—выключныя".

На запытаньне—„А іх адносіны з Камінтэрнам?—Тома адказаў: «Бясспрэчна шчыльныя, але кожны заняты сваёю справаю. Урадавыя дзеячы далёкім аддаюць слабе практычнаму будаўніцтву».

Тома падкрэсьліў, што неабходна аб'ектыўная інфармацыя аб Савецкім Саюзе, бо грамадзкасьць пакінула верыць у глупствы інфармацыйнага друку, які 10 гадоў усё прарочыць блізкую пагібель Савецкаму Саюзу.

«Я спадзяюся, — заявіў Тома,— што знойдуцца людзі, якія вывучаць усё тое асаблівае і канструкцыйнае, што ажыцьцёўлена ў Савецкім Саюзе. Савецкі Саюз, гэта—частка эўрапейскае эканомікі, і бяз яго ўдзелу ніводная міжнародная патуга ня можа быць плённаю. Значэньне Савецкага Саюзу трэба ўлічваць як у галіне разброеньня, так і эканомікі і фінансаў і сацыяльнага законадаўства. У Жэневе ўрады праводзяць перамовы, ня пытаючыся пра ўнутраны лад дзяржаў між тым пекаторыя з іх чакаюць, калі яны ізноў здолеюць мець справу з расейскім урадам, адпаведным іх густу. Савецкі ўрад—факт, які можа быць задзіўлены».

Бакол падарожжа ангельскіх дзелавікоў у СССР.

ЛЁНДАН, 19-2. Карэспандэнт «Дэйлі Тэлеграф» піша, што меркаванае падарожжа дэлегацыі ангельскіх дзелавых колаў у СССР адкладзена. Наконт гэтага карэспандэнт ТАСС зьвярнуўся з запытаньнем да сакратара нядаўна заснаванага англа-расейскага камітэту. Там яму заявілі, што падрыхтоўка да падарожжа адбываецца з посьпехам, але з-за розных арганізацыйных дэталяў магчыма давядзецца выезд дэлегацыі з Англіі адкласьці на некалькі дзён ў параўнаньні з назначаным у пачатку тэрмінам.

СССР І ЛІТВА.

ПЕРАДАЧА ВЯРЫЦЕЛЬНЫХ ГРАМАТ Т. АНТОНАВЫМ-АЎСЕЕНКА.

КОЎНЯ, 18-II. Новы паўнамоцны прадстаўнік СССР у Коўні тав. Антонаў-Аўсеенка перадаў літоўскаму прэзыдэнту Сьмятоне свае вярыцельныя граматы.

* * *

КОЎНЯ, 18-2. У зьвязку з перадачаю вярыцельных грамат новым паўнамоцным прадстаўніком СССР у Коўні Антонавым-Аўсеенкам афіцыёз «Летувос Айдас» зьмясьціў перадавіцу, прысьвечаную дачыненьням Літвы і СССР.

Спыняючыся на значэньні савецка-літоўскіх угавораў 1920 і 1926 г. г., газэта піша: «Угаворы гэтыя ўстанавілі ўсходнія межы Літвы і прызнані Вільню і Горадню за Літвою. Мы з асаблівым задавальненьнем адзначаем, што СССР да гэтага часу цьвёрда прытрымліваецца гэтага погляду». Наконт нацыянальнае палітыкі СССР афіцыёзна заяўляе, што, у той час, як палова жыхарства Польшчы падняволена, «СССР робіць шмат дзеля выхаваньня нацыянальнае сьвядомасьці засельваючых яго народаў і павінен з гэтае прычыны карыстацца прыхільнасьцю нацый».

Урад СССР паранейшаму на абароне бэсарабцаў.

(На пленуме т-ва бэсарабцаў у Маскве).

МАСКВА, 19-2. На пашыраным пленуме таварыства бэсарабцаў з вялікім дакладам аб міжнародным становішчы і бэсарабскім пытаньні выступіў тав. Каларaў. Пасьля прамовы Каларава пленум быў прывітаны тав. Марынам, які 10 гадоў прасядзеў у румынскіх астрогах. Нарэшце пленум аднагодна ўхваліў адозву да рабочых і сялян усяго сьвету і да ўсіх працоўных Бэсарабіі абапал Дністра.

«Працоўныя Бэсарабіі, якіх падтрымлівае міжнародны пралетарыят, і якія змагаюцца супольна з рабочымі і сялянамі Румыніі проці агульнага ворага, румынскае алігархіі,—зазначана ў адозьве,—знаходзілі падтрыманьне ў асобе Саюзу ССР, які няўхільна стаяў і стаіць на абароне інтарэсаў працоўнага жыхарства Бэсарабіі і не прызнае наглага захопу Бэсарабіі Румыніяй. ГЭТАЯ ПАЗЫЦЫЯ САВЕЦКАГА САЮЗУ ЗАСТАЕЦЦА НЯЗЬМЕННАЮ ДА СЁНЬНЕШНЯГА ДНЮ. Падпісаўшы ў Маскве пратакол аб дачасным наданьні правамоцнасьці пакту Келёга, Савецкі Саюз яшчэ раз падкрэсьліў сваю сапраўдную міралюбнасьць і шчырае імкненьне змагацца проці вайны, як зброі нацыянальнае палітыкі. Адмаўляючыся ад вайны, як мэтаду ўпарадкаваньня пытаньня аб Бэсарабіі, САВЕЦКІ ЎРАД І ЗАРАЗ ЛІЧЫЦЬ БЭСАРАБІЮ САВЕЦКАЮ ЗЯМЛЁЮ, ЯКУЮ РУМЫНСКАЯ БУРЖУАЗЕЯ І ВАЕНШЧЫНА АДАРВАЛІ АД СССР ГВАЛТАМ І ПАДМАНАМ. Заява ўраду СССР афіцыйна паказала, што ПРАЦОЎНЫЯ БЭСАРАБІІ МАЮЦЬ, ЯК І РАНЕЙ, У АСОБЕ СССР МАГУТНАГА АБАРОНЦУ. Пралетарыят Савецкага Саюзу падае сваю братэрскую руку заруб ежным таварышом за Дністром. ЛЁС БЭСАРАБІІ БУДЗЕ ВЫРАШАН ПРАЦОЎНЫМІ БЭСАРАБІІ АБАПАЛ ДНЯСТРА ПРЫ ПАДТРЫМЦЫ ПРАЦОЎНЫХ УСІХ КРАЁЎ. Задачы таварыства застаюцца нязьменнымі. Ранейшы лёзунг—«прэч рукі захопнікаў ад Бэсарабіі»—павінен быць ажыцьцёўлены і будзе ажыцьцёўлены.

15-міліённы крэдыт СССР у Нарвэгіі.

ОСЛО, 19-2. Нарвэскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „Большасьцю 108 проці 26 галасоў стортынг (парлямант) ухваліў законапраэкт аб урадавай гарантыі крэдыту на закупку нарэскіх прадуктаў Савецкім Саюзам у разьмеры 15 міліёнаў крон.

У часе спрэчак прэм'ер заявіў, што вопыт Нарвэгіі ў гандлі з СССР да гэтага часу быў здавальняючым.

ЗАМАХ НА ПОЯЗД ФЫН-ЮЙ-СЯНА.

ПЭЙПІН, 19-2. Газэта «Шун-Цянь-Шы-Бао» паведамляе, што бандыты каля Кайфыну (галоўны горад Хэнаньскае правінцыі) учынілі наскок на поезд Фын-Юй-Сяна. Наскок бандытаў быў адбіты.

БАЙ-ЦЗУН-ЧЫ ІДЗЕ КАНЧАТКОВА Ў АДСТАЎКУ.

ПЭЙПІН, 19-2. Як паведамляе мясцовы друк, Бай-Цзун-Чы заявіў аб сваім жаданьні падацца ў адстаўку ў якасьці старшыні 4-е камісіі па дэмабілізацыі. Бай-Цзун-Чы дадаў, што ён, з прычыны свайго нездароўя, ужо падаўся ў адстаўку з пасады камандуючага 4-й арміяй.

СТАЧКА Ў ВУЗУНЕ.

ШАНХАЙ, 18-II. У Вузуне забаставала 1000 рабочых бавоўняных фабрык. Бастуючыя патрабуюць неадкладна аднавіць на працы звольненых рабочых і абмежаваць рабочы дзень.

Межы сьціраюцца...

БЭРЛІН, 19-2. Камуністычная «Ротэ Фанэ», спасылаючыся на пэўныя крыніцы, паведамляе: не зважаючы на ўсе адхіленьні, якія ёсьць у друку, генэральны сэкратар Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу Засэнбах і сэкратар генэральнае рады ангельскіх трэд'юніёнаў Сітрын праводзілі ў Італіі перамовы з фашыстамі па даручэньні Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу. Перамовы ня былі перарваны нават пасьля выезду Засэнбаха і Сітрына з Італіі. в

Барацьба за ўладу ў Аўганістане

ТЭРМЕЗ, 18-2. Паведамляюць, што генэрал-губарнатар Катагана (Бадахшанскае правінцыі) Азімула-хан перайшоў на бок Бачэ-Сакао і перадаў уладу новаскладзенаму часоваму правінцыйнаму ўраду з 5-ці асоб.

У АЎГАНІСТАН ВЫЕХАЎ ПРЫНЦ НАДЫР-ХАН.

ЛЁНДАН, 17-2. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Ніццы, што Надыр-хан (аўганскі прынц, які выехаў з Аўганістану з прычыны разыходзін з Аманулаю ў 1925 годзе), які жыў там, тайна выехаў з Ніццы. Мяркуюць, што Надыр-хан накіроўваецца ў Аўганістан.

НАДЫР-ХАН БУДЗЕ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ З АМАНУЛАЮ?

БЭРЛІН. 19-2. Аўганская місія ў Бэрліне агаласіла павідамленьне наконт чутак, нібыта ранейшы аўганскі пасланьнік у Парыжы Надыр-хан выехаў з Ніццы ў Аўганістан у якасьці новага кандыдата на аўганскі трон. У паведамленьні місіі зазначана, што Надыр-хан паехаў у Аўганістан згодна жаданьня і запросін караля Аманулы для супольнае з ім працы.

ВЫБУХ У ДЖАЛАЛАБАДЗКАЙ КРЭПАСЬЦІ.

КАБУЛ, 16-2. У Кабуле ёсьць весткі, што гэтымі днямі ў джалалабадзкай крэпасьці здарыўся выбух на складзе баявых прыладаў. Шмат зруйнаваньняў у крэпасьці і горадзе.

ДЖАЛАЛАБАД ЗРУЙНАВАНЫ Ў ВЫНІКУ ВЫБУХУ.

ЛЁНДАН, 16-2. Карэспандэнт «Дэйлі Тэлеграф» у Пэшавары пацьвярджае весткі аб зруйнаваньні Джалалабаду.

БАЧЭ-САКАО ПАДКУПЛЯЕ ДУХАЎНІЦТВА.

ЛЁНДАН, 18-2. Агенцтва Рэйтэра паведамляе «Водлуг вестак з Пэшавару, Бачэ-Сакао агаласіў праклямацыю аб аднаўленьні дзяржаўных субсідый рэлігійным лідэрам, якіх яны былі пазбаўлены Аманулаю.

Тав. Марты пераведзенна становішча крымінальніка.

БУРЖУАЗЕЯ ЎМЕЕ РАСПРАЎЛЯЦЦА З СВАІМ КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ.

ПАРЫЖ, 19-2. Касацыйная палата зацьвердзіла прысуд, ухалены ў дачыненьні да Марты па справе аб яго адказе на інтэрв'ю маршала Фоша. У адказ на інтэрв'ю Фоша ў ангельскай часопісі, у якім Фош заклікаў да новае інтэрвэнцыі проці СССР, Марты зьмясьціў у «Юманітэ» артыкул; апошні быў кваліфікаваны пракуратураю, як «заклік да забойства». Па гэтай справе Марты засуджан на 4 гады астрогу і да штрафу ў 3 тысячы франкаў.

Адначасна з зацьверджаньнем прысуду касацыйная палата кваліфікавала „злачынства" Марты, як крымінальнае. Гэта дае магчымасьць прадаўжаць час зьняволеньня Марты ў выпадку нявыплаты штрафу і азначае, што Марты будзе пераведзен на становішча крымінальных зьняволеных.

Крызісная фаза рэпарацыйных перамоў

Францыя рашуча адхіляе нямецкія дамаганьні

МАГЧЫМА, ШТО ПРАЦА КАНФЭРЭНЦЫІ ЭКСПЭРТАЎ БУДЗЕ САРВАНА.

ПАРЫЖ, 19-2. Першая заміна на канфэрэнцыі экспэртаў па рэпарацыйным пытаньні, якая выбухнула ў зьвязку з тым, што ніводная дэлегацыя, не жадаючы выкрываць сваіх намераў, ня хоча падаваць канкрэтных прапаноў аб разьмерах і тэрмінах нямецкіх выплат, выклікала жвавыя абмеркаваньні ў францускім друку. «Эко дэ Пары» зазначае, што пераход да агульнае дыскусіі і канкрэтнага абмеркаваньня лічбаў адразу зьменшыў-бы шансы канфэрэнцыі на посьпех, бо гэта зараз-жа выкрыла-б глыбокія разыходзіны між прадстаўнікамі розных краёў па гэтых асноўных пунктах рэпарацыйнае праблемы. Каб уліліца ад такога становішча, сёняшнее звычайнае пасяджэньне было заменена прыватнымі гутаркамі аб працэдуры далейшае працы камісіі. «Эўр» зазначае, што калі-б Шахт вось цяпер прапанаваў устанавіць штогодзія нямецкія ўзносы ў разьмеры 1.750 міліёнаў марак на працягу 37 гадоў, дык праца канфэрэнцыі была-б перарвана, бо ніякая прапанова, якая не прадугледжвае нямецкіх узносаў на працягу 60-ці гадоў (у адпаведнасьці з часам растэрмінаваньня выплаты міжсаюзьніцкіх ваенных даўгоў) ня можа сурёзна разглядацца. Газэта выказвае надзею, што ў прыватных і сакретных гутарках мэтадамі пераконваньня, а часам і нажымам, можна было-б прымусіць немцаў пакласьці прапановы, якія, калі і не зьявіліся-б пажаданымі, дык, ва ўсякім разе, сталі-б прадмехам дыскусіі.

Француская прэса падкрэсьлівае, што Нямеччына, зьяўляючыся ініцыятыўным краем канфэрэнцыі, павінна першаю выступіць з канкрэтнымі прапановамі. Як зазначае францускі друк, Нямеччына ставіць устанаўленьне сумы і часу нямецкіх выплат у залежнасьць ад захаваньня ці скасаваньня пункту ў плане Даўэса, які абавязвае генэральнага агента па рэпарацыях сачыць, каб пераводы нямецкіх выплат не адбывалісь на стане нямецкае валюты, а таксама ў залежнасьць ад прадугледжанага плянам Даўэса прагрэсіўнага індэксу нямецкага дабрабыту.

Як паведамляе парыскае выданьне «Чыкаго Трыбун», у канцы ўчарайшага свайго дакладу аб эканамічным становішчы Нямеччыны Шахт, між іншым зазначыў, што эвакуацыя Рэйнскае вобласьці павялічыла-б вытворчыя сілы Нямеччыны і пашырыла-б яе замежны гандаль. Пры гэтым Шахт ізноў падкрэсьліваў залежнасьць між платаздольнасьцю Нямеччыны і разьвіцьцём замежнага гандлю, які натыкаецца на мытныя перашкоды.

МОРГАН ТАКСАМА НАЦІСКАЕ НА НЯМЕЧЧЫНУ.

ПАРЫЖ, 19-II. Агенцтва Гаваса паведамляе. «Камітэт экспэртаў зьвярнуўся да ангельскага дэпутата Стэмпа і нямецкага—Шахта з просьбаю як-небудзь дамагчыся супрацоўніцтва з дэлегатамі Францыі, Італіі і Бэльгіі і зкайсьці лепшыя мэтады для далейшае працы канфэрэнцыі".

ПАД ЗНАКАМ ВЕРНАСЬЦІ КАМІНТЭРНАУСКАМУ КІРАЎНІЦТВУ.

Зьезд аўстрыйскае кампартыі.

ВЕНА. 16-га лютага ў Вене пачаўся 10-ты зьезд аўстрыйскае кампартыі. Удзельнічае 49 дэлегатаў, з іх толькі адзін апазіцыянэр з правам рашаючага голасу. Іншыя апазіцыянэры маюць толькі права дарадчага голасу.

Тав. Копленіг у палітычным дакладзе ЦК зазначыў, што аўстрыйская кампартыя стаіць на платформе настаноў Камінтэрну. Аўстра - марксызм абанкроціўся, але яго спадчыну пераняла правая апазіцыя ў шэрагах кампартыі. Дакладчык пералічыў такія задачы кампартыі: узмацненьне барацьбы проці фашызму і ваеннае небясьпекі, актыўнае падтрыманьне СССР і Чырвонае арміі на выпадак вайны, рашучае адмежаваньне ад рэфармістаў, ліквідацыя правых тэндэнцый, вызваленьне партыі ад нешматлікіх трацкістаў, забясьпека адзінага кіраўніцтва.

Выступіўшы з садакладам аб праграму апазіцыі Шлам заявіў, што апазіцыя хоць і застаецца пры сваіх поглядах, але абяцае падпачаліца пастановам партыі і выконваць дысцыпліну.

У спрэчках зьезд аднадушна зганьбіў погляды апазіцыі.

ВЕНА. 19-2. Скончыўся зьезд аўстрыйскае кампартыі. Прадстаўнікі выканкому Камінтэрну і нямецкае кампартыі заклікалі прыхільнікаў апазіцыі поўнасьцю адмовіцца ад свайго погляду, якога нельга цярпець у шэрагах партыі. Па палітычным дакладзе ЦК зьезд усімі галасамі, проці аднаго голасу апазіцыі, ухваліў рэзалюцыю ў духу тэзісаў дакладчыка, генэральнага сэкратара партыі Копленіга.

У склад новага ЦК партыі, абранага зьездам, не ўвайшоў ніводзін з кандыдатаў, прапанаваных апазіцыяй.

АЛЬФОНС ВЫКОНВАЕ РОЛЮ ДЭ-РЫВЭРА.

ПАЎСТАЎШЫЯ КАРПУСЫ РАСФАРМАВАНЫ.

ПАРЫЖ, 19-2. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Водлуг вестак з гішпанскае мяжы, гішпанскі кароль падпісаў сёньня дэкрэт аб расфармаваньні некаторых артылерыйскіх карпусоў».

АМНІСТЫЯ Ў ГІШПАНІІ АДМЕНЕНА.

ПАРЫЖ, 18-П. Водлуг вестак французскага друку, 16-га лютага Прыма-дэ-Рывэра з усім урадам падаўся ў адстаўку ў знак пратэсту проці жаданьня караля абвясьціць палітычную амністыю „як ўдзячнасьць жыхарству за выказанае ім спачуваньне ў зьвязку са сьмерцю каралевы-маткі".

Пасьля таго, як кароль адмовіўся даць амністыю, заявіўшы, што ён «згодзен лепш на далейшыя рэпрэсіі, чымся на ўрадавы крызіс", Прыма-дэ-Рывэра ўзяў адстаўку назад.

24 дзень галадоўкі т. Дабраджэяну.

ВЕНА, 19-2. Як паведамляюць з Бухарэсту, галадоўка зьняволенага румынскага камуніста Дабраджэяну-Герэа цягнецца ўжо 24-ты дзень.

Сані-ракета.

БЭРЛІН. 19-2. Учора на Штарнбэргерскім возеры пад Мюнхенам рабіліся выпрабаваньні саней-ракеты, змайстраваных інжынэрам Максам Вальерам. Найбольшая хуткасьць дасягнута ў 378 кілёмэтраў у гадзіну.

Прывітальная тэлеграма ЦВК і СНК БССР.

Рабочыя, сяляне, чырвонаармейцы і прадстаўнікі грамадзкіх арганізацый, сабраўшыся на пасяджэньне, прысьвечанае 3-му тыражу выйгрышаў пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі, шлюць гарачае прывітаньне ЦВК і СНК БССР.

Народная гаспадарка Беларусі з году ў год пашыраецца і ўзмацняецца. Шпаркім тэмпам ідзе перабудова ўсёй прамысловасьці і сельскае гаспадаркі на новай тэхнічнай базе. Гэты ўздым народнае гаспадаркі, які адбываецца пры актыўным удзеле працоўных, прывядзе нас да канчатковай перамогі сацызлізму.

3-ці тыраж выйгрышаў пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі, які праводзіцца пры шырокім удзеле рабоча-сялянскіх мас Беларусі і прадстаўнікоў Украіны, будзе яшчэ больш садзейнічаць укладам зьбераженьняў працоўных у справу сацыялістычнага будаўніцтва.

Нашым лёзунгам і надалей будзе: УСЕ ЗЬБЕРАЖЭНЬНІ ПРАЦОЎНЫХ МАС—НА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ КРАІНЫ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ РАБОЧА-СЯЛЯНСКІ ЎРАД—АРГАНІЗАТАР САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА!

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ І ЎЗМАЦНЯЮЦЦА САВЕТЫ—ОРГАНЫ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ БССР І СССР.

Г. МАГІЛЕЎ. ТЫРАЖНАЯ КАМІСІЯ.

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПРАТЭСТУ

ПРОЦІ СУДУ НАД ГРАМАДОЙ І БЕЛАГА ТЭРОРУ Ў ПОЛЬШЧЫ І ЗАХ. БЕЛАРУСІ

(Прынята аднагалосна на зьезьдзе навуковых працаўнікоў БССР па інфармацыі прадстаўніка камітэту па адарэ Грамады акадэміка Г. Гарэцкага).

Фашыоцкі ўрад, разграміўшы 100 тысячную арганізацыю рабочых і сялян Заходняй Беларусі—Сялянска-Работніцкую Грамаду, пасадзіў сотні актыўных работнікаў гэтае арганізацыі на лаўку падсудных.

На працягу году ішлі працэсы Грамады, адбывалася камадзія суду ў Вільні, Беластоку, Горадні і іншых пляцоўках Заходняе Беларусі.

На падставе штучных і іншых паказаньняў паліцэйскіх і шпінаў сотні лепшых сыноў Зах. Беларусі атрымалі катаржныя прысуды толькі за тое, што яны змагаліся за нацыянальна-сацыяльнае вызваленьне, імкнуліся палепшыць эканамічнае становішча рабочых і сялян, толькі за тое, што яны імкнуліся працаваць на ніве беларускае культуры, за тое, што яны асьмеліліся выяўляць сымпатыі да Савецкай Беларусі.

Да магутных пратэстаў рабочых, сялян і культурных дзеячоў БССР і ўсяго Саюзу супроць зьдзеку з польскага фашысцкага ўраду над працоўнымі Зах. Беларусі, да магутнай хвалі пратэстаў, якія пакаціліся ад працоўных і культурных дзеячоў Эўропы, Амэрыкі і нават далёкай Аўстраліі польскі фашысцкі ўрад застаўся глухім. Катаржныя прысуды адбыліся. Сотні лепшых прадстаўнікоў рабочых і сялян Зах. Беларусі апынуліся ў казэматах і турмах Польшчы.

З усіх абвінавачаных суд вызваліў толькі Астроўскага і А. Луцкевіча, пакольні першы адкрыта а другі, прыкрываючыся нейтральнасьцю, фактычна перайшлі на службу да польскага фашызму.

Увянчаўшы кампанію рэвізіі з беларускімі згодкамі вынік надыходзячага апазыцыйнага суду над Грамадой, польскі фашызм дзеліць грамадзяна на беларускіх нацыяналістаў і камуністаў, абяцаючы першым памілаваньне і міварная задачні, а для другіх рыхтуючы рэпрэсіі і катаржныя прысуды.

Гэтым фашызм імкнецца адарваць хістотныя элементы ад нацыянальна рэвалюцыйнага руху, каб з іх дапамогаю разьбіваць гэты рух.

Фашызму на ўдосца хітрымі маневрамі абманыць рабочых і сяўдоўныя масы сялянства Зах. Беларусі, якія бачаць, якія даверяюць адзінаму кіраўніку і змагару за інтарэсы працоўных—КПЗБ.

Мы патрабуем спыненьня белага тэрору і нацыянальнага ўціску над шырокімі працоўнымі масамі Зах. Беларусі.

Мы патрабуем свабоды дзейнасьці для палітычных, культурных і эканамічных арганізацый рабочых і прыгнечанага сялянства Заходняй Беларусі.

Мы заклікаем працоўныя масы і культурных дзеячоў СССР і ўсяго сьвету ўзьнімць рашучы голас супроць нячуваных зьдзекаў і польскага фашысцкага ўраду над працоўнымі Зах. Беларусі, за вызваленьне тысяч невінна засуджаных людзей, якія апынуліся за кратамі польскіх турмаў.

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЕЗДУ.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Працэс 31-го украінскага камуніста.

ВАРШАВА, 19-2. У Львове распачаўся працэс 31-го абвінавачанага ў прыналежнасьці да кампартыі Заходняе Украіны. Працэс працягнецца блізка 10-ці дзён.

Адстаўка мін. Чэховіча ня прынята.

З прычыны сталых закідаў, якія рабіліся пэўнымі соймавымі коламі міністру скарбу Чэховічу, гэты апошні падаўся было ў адстаўку, аднак прэм'ер Бартэль вьярнуў п. Чэховічу просьбу аб адстаўцы і асьведчыў, што цэлы габінэт салідарызуецца з дзейнасьцю міністра скарбу.

Прэм'ер Бартэль едзе ў Гданск.

26 лютага польскі прэм'ер Бартэль едзе ў Гданск з мэтаю знажыць афіцыйныя візыты гданскаму сэнату. Разам з Бартэлем выязджае міністр шляхоў зносін Кюн і вышэйшыя ўрадоўцы прэзыдыуму рады міністраў і мін. замежных спраў.

Польскі салдат забіў і параніў 4 асобы.

Польскі салдат Сьцяпан Пэўлоўскі прышоў да сваіх знаёмых п'яны і ў часе спрэчкі з прысутнымі забіў з рэвальвэру Р. Качмэрцуну і Гадлеўскага і параніў Бенека і Глупчынскага, пасьля чаго двумя выстрэламі цяжка параніла сябе.

Бойкі з-за вугалю.

У сувязі з марозамі і завеямі ў Лодзі не хапае вугалю. Натоўпы жадаючых дастаць вугалю накінуліся на адзін з складаў і пачалі разьбіраць яго. Паліцыя ў часе бойкі з нападаўшымі цяжка параніла 4 асобы.

Беспрацоўныя галадуюць.

Віленскія беспрацоўныя зьвярнуліся да віцэ-прэзыдэнта г. Вільні В. Чыжа з вымаганьнем распачаць акцыю дапамогі галадуючым беспрацоўным.

Рост беспрацоўя ў Нямеччыне.

(АРТЫКУЛ ЧЛЕНА ЦК КП НЯМЕЧЧЫНЫ ТАВ. АПЭЛЬТА).

Рост беспрацоўя за апошнія некалькі тыдняў зьяўляецца характэрнай асаблівасьцю сучаснага разьвіцьця гаспадарчых і палітычных дачыненьняў у Нямеччыне. Гэта раптоўнае павялічэньне беспрацоўя лішні раз пацьвярджае ўсю нятрываласьць і хісткасьць капіталістычнае стабілізацыі. Ад часу рацыяналізацыі капіталістычнае прамысловасьці армія беспрацоўных палічвае нават у пэрыяд добрае кан'юнктуры звыш паўтара міліёны чалавек.

Беспрацоўе зрабілася цяпер ня толькі няўхільным вынікам крызісу, а арганічным дадаткам капіталістычнае прамысловасьці. Павялічэньне ліку беспрацоўных у два разы ў працягу некалькіх тыдняў азначае, што пры малейшым ваганьні кан'юнктуры сталая армія беспрацоўных павінна будзе адразу моцна павялічыцца. У сучасны момант у Нямеччыне налічваецца каля 4-х міліёнаў беспрацоўных.

Афіцыйная статыстыка, якая рэгіструє толькі тых беспрацоўных, што атрымліваюць дапамогу на падставе закону аб забясьпечаньні беспрацоўных, налічвала на 15-га студзеня 1929 г. 2 міліёны рабочых, якія стала атрымліваюць дапамогу, 138 тысяч—часова атрымліваючых дапамогу і каля трох чвэртак міліёну, якія карысталіся розьнымі іншымі выглядамі дапамогі. Рэшта—каля аднаго міліёну беспрацоўных—не атрымлівае ніякае дапамогі.

Некаторыя буржуазныя эканамісты бачаць у гэтым раптоўным росьце беспрацоўя адзнакі эканамічнага крызісу, які пачынаецца, і тлумачаць гэта спыненьнем сэзонных работ у будаўнічай прамысловасьці і сельскай гаспадарцы. Але зараз яшчэ рана гаварыць аб эканамічным крызісе, пакуль важнейшыя галіны прамысловасьці цалком загружаны, а спыненьне сэзонных работ таксама не магло ў некалькі тыдняў павялічыць лік беспрацоўных ад паўтара да 4-х міліёнаў. У наяўнасьці—толькі пазначнае пагоршаньне кан'юнктуры. Але гэта пагоршаньне, якое азначае канец высокай кан'юнктуры, што цягнулася два гады, прадпрыемцы выкарыстоўваюць для таго, каб пазбавіць заработку міліёны рабочых.

На справе-ж за ростам беспрацоўя вымалёўваюцца абрысы грандыёзнага наступальнага пляну капіталістаў на рабочую клясу. Каб уліліца шкоды для капіталістычнага прыбытку ад пагоршаньня гаспадарчае кан'юнктуры, капіталісты павялі энэргічны наступ на жыцьцёвы ўзровень пралетарыяту. Гэты наступ быў падрыхтован ужо ў часе вялікіх эканамічных боек у сярэдзіне леташняга году; даволі ўспомніць хоць бы лёкаут 213 тысяч мэталістаў у Рурскай вобласьці. Рабочая клясa энэргічна баранілася ад гэтага нападу капіталу і з свайго боку перайшла ў контрнаступ. Гэтая контратака паказала капіталістам, што пралетарыят без барацьбы ня згодзіцца на скарачэньне заработку і павялічэньне рабочага дню. Таму капіталісты ідуць цяпер на сьвядомае скарачэньне прадукцыі пры адначасовым звальненьні ўсіх рабочых, якія не зьяўляюцца бязумоўна необходнай рабочай сілай, каб такім чынам захаваць свой прыбытак. Гэта павінна, з аднаго боку, утрымаць цэны на прадукты на высокім узроўні, ці, быць можа, яшчэ больш павялічыць, а з другога боку зрабіць націск на жыцьцёвы ўзровень рабочых, каб дабіцца ад іх больш уступчывасьці да скарачэньня зарплаты і падоўжаньня рабочага дню.

Гэты плян зусім адкрыта выцякае з паведамленьняў капіталістычнае прэсы, якая запэўняе, што сучасны ўзровень зарплаты вельмі цяжкі для прамысловасьці, якую чакае нямінучы крызіс, калі тыя ж стаўкі будуць захаваны ў будучым. Сам урад, у якім ёсьць і сацыял-дэмакраты, згаджаецца з гэтымі довадамі капіталістаў. Прускі міністр гандлю доктар Штрэйбэр у сваім дакладзе аб фінансавым становішчы краіны ў прэзыдыуме Прускага ландтагу, закранаўшы пытаньне аб беспрацоўі, заявіў літаральна наступнае: «Наша гаспадарка ня ў стане даць працу і хлеб многім грамадзянам. Яна ня можа забясьпечыць пралетарыяту пражыцьцёвы мінімум у выпадку абвастрэньня крызісных вынікаў».

Зусім ясна, што капіталісты ня зьбіраюцца зьвяртаць увагу на ўмовы існаваньня рабочае клясы і зусім ня думаюць аб тым, каб забясьпечыць яму пражыцьцёвы мінімум. Але ў буржуазных колах ужо адкрыта выказваюць меркаваньні, што рост беспрацоўя небясьпечны тым, што можа даць новы штуршок да новага ўздыму рэвалюцыйнага руху. Але рабочыя здолеюць адбіць і гэтую новую атаку капіталістаў. На ўсёй Нямеччыне ўжо адбываюцца дэманстрацыі беспрацоўных, якія маюць яскрава выяўлены баявы характар. У выніку вялікіх эканамічных боек, якія мелі месца ў Нямеччыне за апошні год, пралетарыят пачаў лепш улічваць сваю моц, чымся, напрыклад, у 1926 годзе, калі таксама было нямала крызісаў. Гэта ўзрослае ўяўленьне сваёй моцы пралетарыятам прымушае ня толькі буржуазею, але і сацыял-дэмакратаў і рэфармісцкую прафбюракратыю аддаваць асаблівую ўвагу беспрацоўю, рабіць спробу стаць на чале руху беспрацоўных, каб такім шляхам дамагчыся найбольш мірнага вырашэньня надыходзячых канфліктаў. Але нямецкія рабочыя ў апошні час навучыліся давяраць сваім уласным сілам. Перш за ўсё яны зразумелі, што іх становішча не палепшыцца ад таго, калі беспрацоўныя будуць змагацца асобна ад іншых рабочых, што іх барацьба павінна ісьці супольна з барацьбой рабочых, занятых у вытворчасьці. Нямецкая кампартыя арганізуе беспрацоўных для супольнае барацьбы

У Саюзе ССР.

Вось у каго трэба павучыцца.

ШАХЦІНСКІЯ ГАРНЯКІ ЎХВАЛІЛІ ПРАЦАВАЦЬ У НЯДЗЕЛІ. КАБ ДАМАГЧЫСЯ ВЫКАНАЕЬНЯ ПЛЯНАВЫХ ЗАДАНЬНЯЎ.

АРЦЁМАЎСК, 20-II. З прычыны таго, што ў лютым толькі 28 дзён, гарнякі самых буйных у акрузе Гарлоўскага і Шчарбінаўскага рудакіраўніцтваў, каб выканаць заданьне, ухвалілі працаваць у нядзелі. Так, на 17-га лютага (нядзеля) на капальнях здобыч дасягнуў больш 3-х тысяч тон вугалю. Пры гэтым трэба адзначыць, што капальня Цэнтральная, Шчарбінаўскага рудакіраўніцтва дала за адну зьмену 996 тон вугалю, у той час, як за 3 зьмены нармальнага працоўнага дню здобыч вугалю не перабольшваў 1.500 тон вугалю.

Спатканьне прадстаўнікоў навукі і абароны.

ЛЕНІНГРАД. 19-га лютага ў Акадэміі Навук пад старшынствам Карпінскага адбылося ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае 11-му году Чырвонай арміі.

Ва ўступным слове акадэмік Карпінскі зазначыў, што ўсё жыхарства Савецкага Саюзу, не зважаючы на яго разнапляменны склад, зьяўляецца ворагам нападкаў на іншыя краі і лічыць, што нашыя вайсковыя сілы накіраваны на абарону нашага краю ад магчымых вонкавых нападаў.

Прадстаўнік падшэфнай Акадэміі Навук Вайскова-Палітычнай Акадэміі імя Талмачова т. Баранцаў зрабіў даклад аб задачах Чырвонае арміі ў сучасны момант.

Няьменны сэкратар Акадэміі акад. Ольденбург у сваёй прамове, між іншым, сказаў:

«На сьцягу Чырвонай арміі напісана слова „спакой", але гэтае слова, адна, не прадыктавана нашаю слабасьцю Жыхарства непарыўна злучана з інтарэсамі Чырвонай арміі, якая адначасна адыгрывае выключную ролю і ў нашай культурнай рэвалюцыі. Адважнай Чырвонай арміі пылкае прывітаньне".

Кулакі зрываюць ачыстку збожжа.

ЛЕНІНГРАД, 19-2. З некаторых акругаў надыходзяць трывожныя весткі аб кулацкай агітацыі проці ачысткі збожжа. Кампанія па ачыстцы збожжа распачата па ўсей Ленінградзкай вобласьці, але праходзіць з перашкодамі. Кулакі, агітуючы проці ачысткі насеньня, заяўляюць, што селянам, якія пакажуць сваё насеньне, ня будзе выдавацца ўвесну ні насеньня, ні хлеба, што ачыстка збожжа наладжана не для паляпшэньня насеньня, а для праверкі наліччa засеўнага матар'ялу ў селян. У выніку, напрыклад, у Лускай акрузе за ўвесь час ачышчана менш як 5 проц. насеньня, не зважаючы на тое, што ў акрузе ёсьць 71 абоз для ачысткі збожжа, апроч некалькіх дзесяткаў пуньтаў па ачыстцы. Пратраўленьне збожжа праходзіць яшчэ горш.

Арганізаваны байкот сялянствам зрыўшчыкаў загатовак.

РАСТОЎ-ДОН, 14-2. У Донскай акрузе ў некаторых станічных і высковых спажывецкіх таварыствах праводзіцца арганізаваны байкот заможных сяброў таварыства, якія маюць значныя лішкі хлеба, але не прадаюць яго каапэратывам. Згодна патрабаваньня пайшчыкаў байкатаваныя выключаюцца з сяброў таварыства і запісваюцца на чорнай дошцы. Застрэльшчыкам і грамадзкага байкоту выступае беднота і каапэратыўны актыў. У станіцы Канелаўскай з сяброў каапэратыву выключана 32 асобы, а 9 пайшчыкаў запісаны на чорную дошку. У станіцы Мічэцінскай актывісты вывезлі чорную дошку з 16-цю пайшчыкамі, якія трымалі хлеб і не здавалі яго. Гэты захад зараз-жа даў вынікі: 10 хлебаробаў прывезьлі збожжа на ссыпны пункт.

Спробны нумар „Сельско-хозяйственной газеты".

МАСКВА, 19-2. Выйшаў спробны нумар «Сельско-хозяйственной газеты» — органу СНК СССР. Газэта будзе ўсебакова высьвятляць шляхі ўздыму індывідуальнае серадняцкае і бядняцкае гаспадаркі, шляхі фарсіраванага каапэраваньня і калектывізацыі вёскі і будаўніцтва савецкіх гаспадарак.

Злоснае нежаданьне ехаць на вёску.

ЛЕНІНГРАД. 18-2. У Ленінградзе выкрыта злоснае нежаданьне шматкаго з аграномаў ехаць на працу ў васковыя мясцовасьці і вобласьці. У Ленінградзе на біржы працы зараз зарэгістравана 168 беспрацоўных аграномаў. У гэты-ж час абласному земельнаму аддзелу патрэбна для праведзеньня веснавое засеўнае кампаніі больш 200 аграномаў. З гэтага ліку беспрацоўных 92 аграномы адмовіліся ехаць у вобласьць. У зьвязку з гэтым ухвалена, што ўсе аграномы, якія адмовяцца ехаць на вёску, будуць зьвяты з вучоту.

Разрыў з серадняком на руку кулаку.

ЦЬВЕР, 19-2. Пры праведзеньні перавыбараў сельсаветаў у вёсцы Куратнікавай, Цьвярскога павету, на сход, прысьвечаны перавыбарам, ня былі дапушчаны сераднякі бяз ніякае на гэта падставы. Там-жа адзначана незаконнае пазбаўленьне сераднякоў выбарчых правоў. Пратэставаўшыя абвінавачваліся ў варожай дзейнасьці да саветаў і нават арыштоўваліся.

Прэзыдыум губвыканкому прызнаў гэты факт разрыву блёку беднаты з серадняком самаю грубою памылкаю, якая здарылася па віне ўпаўнаважаных па перавыбарах Сямёнава і Івачкіна, і ўхваліў прыцягнуць іх да судовае адказнасьці.

Злачынца, прыкрыты маскаю селькора.

КІЕЎ, 13-II. Абураючы факт злоўжываньня званьнем селькора выяўлен у вёсцы Нядзелішчы на Карасьвеншчыне. Жыхар гэтае вёскі Раман Мацьвеенка ў заметцы у рэдакцыю газэты «Новае Слова» вавісаў аб старшыні сельсавету Кішчуку, што ён п'яніца і робіць напойкі з кулакамі.

У выніку заметкі Кішчук быў зьняты з працы і арыштован. Мацьвеенка пачаў у далейшых сваіх карэспандэнцыях аблівать грязёю ўсіх непажаданых для сябе асоб. Зараз устаноўлена, што сам Мацьвеенка ў мінулым быў бандытам і ўдзельнічаў у розных налётах. Ён-жа забіў настаўніка Мелянецкага.

Жыхары вёскі Нядзелішчы вельмі абураны выступленьнем бандыта Мацьвеенкі у ролі селькора і патрабуюць неадкладна накладзіць наказальны суд над ім.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ДРУГІ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР У ГОМЕЛІ КАРЫСТАЕЦЦА ПОСЬПЕХАМ.

ГОМЕЛЬ, 20-II. Другі Беларускі Дзяржаўны Тэатр заканчвае свае пастаноўкі. Тэатр карыстаўся вялікай папулярнасьцю сярод працоўных, што сьведчыць наведваньне тэатру: 90 проц. працоўных наведалі пастаноўкі тэатру. Асобныя пастаноўкі праводзіліся да 10 разоў.

Канфэрэнцыя гледачоў адзначыла надзвычайна вялікую працу, праробленую тэатрам у галіне беларусізацыі, падвышэньня культурнага ўзроўню.

Канфэрэнцыя прызнала неабходным прыезд тэатру ў будучым сэзоне.

ДУМКІ СЯЛЯН ПРА СЯЛЯНСКУЮ ПАЗЫКУ.

НЯВЕРЦЕ ЗАМОЖНІКАМ І КУЛАКАМ.

Наконт сялянскае пазыкі заможнікі нашага сельсавету распаўсюджвалі чуткі, што пазыка гэта—дадатковы падатак, што савецкая ўлада імкнецца ўсімі шляхамі „выжаць сок" з сялян. Чуткі мелі ўплыў. Аблігацыі купляліся неахвотна. Сялян, выступаўшых супроць заможнікаў, падымалі на сьмех і называлі дурнямі.

Прачытаньне 3-га тыражу сялянскае пазыкі ў гушчы сялянскіх мас Клімаўшчыны, яе галоснасьць і адчыненасьць для працоўных—дасьць рашу чы адпор варожым сілам савецкаеўлады.

Па звароту з тыражу я даю абяцаньне сумленнага грамадзяніна Савецкае Рэспублікі ўсюды, усім і кожнаму, у супярэч злосным нашэптваньням кулацтва ўсямерна ўнядраць сьвядомасьць аб карысьці і значнасьці сялянскае пазыкі для сялянства, хай-бы мне за гэта пагражала помста з боку тых, каго пралетарская дзяржава заве клясавымі ворагамі.

Гр-н Галіцка-Мызкага (нацыянальна-латыскага) с-с. Клімавіцкага райёну **Расса Карл Рыгораў.**

Перавыбары—наша сьвята.

Мазыр, 20-2. У суботу 16 лютага роўна а 5-й гадзіне ўвечары ў двары пэдтэхнікуму пачалі зьбірацца камсамольскія ячэйкі і школьнікі ўсяго гораду. Сабралася больш 1000 чалавек. Сёньня камсамольскі карнавал прысьвечаны перавыбарам гарсавету.

З клюбу будаўнікоў з музыкай выходзяць будаўнікі, якія ідуць у гарадзкі тэатр на перавыбары гарсавету, за імі з двара пэдтэхнікуму выходзіць камсамольская арганізацыя і будаўнікі.

Дэманстранты з лёзунгамі абыходзілі ўвесь горад, наладзілі мітынг, пускалі ўгару фэйерверк. Камсамольцы зразумелі задачу, якая перад імі стаіць і зьявіліся на справаздачныя сходы на ўсе 100 проц.

Не адсталі і будаўнікі. 98 проц. будаўнікоў зьявілася на перавыбарчы сход.

Загатоўка скурсыравіны ідзе пасьпяхова.

(Ліст з Мазыра).

На нарадзе запікаўленых устаноў па загатоўцы сыравіны, якая адбылася пры акрэгаліі, была заслухана інфармацыя аб становішчы загатовак скурсыравіны.

З інфармацыі відаць, што рынак па збыту сыравіны ў акрузе добра ўпарадкаваны.

Значна павялічася загатоўчая дзейнасьць прыватніка. За 1 квартал 1928-29 г. плян загатовак буйных скур выкананы на 145 проц., і дробных скур на 142 проц. і г. д.

Як недахоп трэба адзначыць недапусьпімы таварообмен (Пятрыкаўскае спажывецкае таварыства), скрыўленьне лініі па прэміраваньні загатовак хлеба, ільнавалакна, ільнанасеньня, дапускаючы прэміраваньне здатчыкаў скурсыравіны, пушніны, шчацінны (Пятрыкоўскае, Калінкавіцкае, Нараўлянскае спажывецкае таварыства).

Скурзагатоўцы ня выконвалі дырэктыў акрэгаліі аб дагаворанасьці наміж загатоўцамі ў райёнах, наконт выніманьня загатоўчых пун за кошт дастаўкі да чыгуначнай станцыі. У выніку чаго наглядаюцца выпадкі недапускавых цэн у райёнах.

Акрэгаліі заставаў абвясьці ў праўленьнях Пятрыкаўскага, Нараўлянскага спажывецкага таварыства і Пятрыкоўскаму і Каралінскаму с.-г. таварыствам суровы выгавар з агалашэньнем у друку і напярэдаваньнем, што, у выпадку паўтарэньня такіх зьявішчаў, вінаватыя будуць аддаваны пад суд.

Яўхім.

Кулакі падпалілі будынак бедняка актывіста.

Клясавы вораг ня сьпіць. Ён актыўна выступае на перавыбарах. У вёсцы Вуглёўшчыны, Талочынскага райёну, Аршанскай акругі кулакі пад кіраўніцтвам былога царскага жандара і былога камсамольца-падкулачніка зрабілі тайную нараду, на якой абгаварылі як дзейнічаць на перавыбарах, высунулі свой сьпіс у склад сельсавету.

На перавыбарчым сходзе ўсё кулакамі было падрыхтавана. Кандыдатуры ў сельсавет, прапанаваныя ад партыйнай ячэйкі і групы беднаты, яны правалілі, а правялі сваіх.

Калі супроць кулацтва выступіў на сходзе адзін бядняк, дык яны яму адпомсьцілі. Яны падпалілі яго хлеў. І гэта ўсё было зроблена ў часе сходу.

Талочынскай райміліцыяй па гэтай справе арыштаваны тры кулакі падпальшчыкі з вёскі Вуглёўшчына.

Але мы пытаемся ў партыйнай ячэйкі, чаму гэта здарылася, чаму яна не арганізавала беднату?

Селькор Хаім Зак.

Мэханізацыя заводу палепшыць якасьць прадукцыі.

Гомель, 20-2. Распачата мэханізацыя клінкёрнага заводу. На заводзе ўстанаўляецца 10 розных машын.

Мэханізацыя заводу палепшыць якасьць прадукцыі і павялічыць прадукцыйнасьць працы. Сёлета завод намячае выпусьціць 1600 тысяч штук клінкёру.

Падрыхтоўваем будаўнікоў.

Гомель, 20-2. У Гомелі арганізуюцца курсы па падрыхтоўцы дарожных дзесятнікаў.

На курсах будуць навучацца 40 чалавек. Усе курсанты будуць забясьпечаны інтэрнатам і стыпэндыяй у 25 руб. у месяц. На ўтрыманьне курсаў будзе асыгнавана 13 тысяч руб.

Скончыўшыя курсы ўсе курсанты будуць выкарыстаны на працы па шляхаваму будаўніцтву.

Да адказнасьці такіх каапэратараў.

Барысаў, 14-II. Вялаціцкае спажывецкае таварыства патрабуе хуткага аздараўленьня ў зьвязку з тым, што ў каапэрацыі весялі шкодныя элемэнты. Старшыня праўленьня Меркін выдае кулакам і заможнікам па некалькі пудоў хлеба. Хлебазагатоўкі праводзяцца нядбайна, апарт каапэрацыі гэтым зусім ня цікавіцца.

Між тым спэкулянты вывозяць з гэтага району цэлымі абозамі збожжа.

Гэта каапэратараў злачынцаў не датычыцца. Нядаўна з крамы невядома куды зьнік тавар на 700 руб. Ніхто з каапэратараў ня ведае, дзе дзяваўся тавар. Да гэтага часу ў каапэрацы ўтворан шэраг растрат, але гэта нікога не датычыцца.

Мы патрабуем тэрміновага прыцягненьня шкоднікаў каапэрацыі да судовай адказнасьці.

З аглядам не сьпяшаюцца

Полацак, 14-II. Кампанія агляду вытворчых нарад да гэтага часу яшчэ ня сустрэла ўвагі з боку прафэсыянальных арганізацый. Тут гэтае мерапрыёмства ўсё яшчэ «прапрацоўваецца», „узгадняецца", і «абгаварваецца» у пішыні габінэтаў.

— Няма чаго сьпяшацца,—кажуць у адным з саюзаў. Некаторыя з прафсаюзных працаўнікоў (асабліва гэтым хварэюць мясцкомы) думаюць, што «агляд, які арганізавала „Праўда", датычыцца толькі фабрык і заводаў.

— Чаго будзеш аглядаць у саўустанове, дробязь,—гавораць адны з такіх таварышоў.

— У нас няма ўжо чаго рабіць вытворчай нарадзе,—з гонарам заяўляюць другія.

Ёсьць выпадкі яўнага тормазу гэтай кампаніі. Вось прыклад. Адміністрацыя паштовай канторы, імкнучыся да лепшай арганізацыі абгляду, рашыла папярэдне арганізаваць і правесьці «двухтыдневік вытворчых прапаноў». Партячэйка прапанавала пачаць гэтае мерапрыёмства, працаўнікі ўжо рыхтавалі прапановы.

Але... (яно заўсёды перашкаджае) старшыня акраддзяленьня «прынцыпова» адмовіўся абгаварыць гэтае пытаньне на акраддзяленьні і двухтыднёвік быў сарван.

— Ня трэба ўмаляць ролю саюзу, прычым тут ініцыятыва адміністрацыі, ня трэбе ле,—гаварыцца старшыня сваім галавацінствам.

Усе гаспадарчыя арганізацыі на кампанію глядзяць праз пальцы, яны лічаць агляд «непасрэдчай справай саюзу». «Чырвоная Полаччына» таксама ўпарта замоўчвае кампанію агляду.

Мік. С.

Тэлефанізацыя сельскіх саветаў.

Барысаў, 20-2. *З мэтай трыманьня лепшай сувязі з сельсаветамі прэзыдыум Барысаўскага РВК узьняў хадайніцтва перад АВК аб праведзеньні тэлефанізацыі ў наступных сельсаветах: В. Стахаўскім, Глівінскім, Жыцькоўскім, Забашэвіцкім, Неманіцкім, Бродаўскім, Азьдзяціцкім і Лозінскім.*

Бібліатэка ў „парадку".

У Тураўскім райкампарце ёсьць вялікі запас розных брашур і часопісаў, якія захаваны, як архіўны матар'ял. Там можна знайсьці і «Деревенский Коммунист» і «Спутник Агитатора» і інш. па 6 экземпляраў. Між тым часопісі маглі-б быць скарыстаны ў ячэйках, але чамусьці райком іх туды не пасылае.

Неабходна Тураўскаму райкампарту і разам з ім іншым райкомам падумаць аб скарыстаньні атрымліваемай літаратуры.

Б.

ПРАВОДЗІМ КОНКУРС.

Карыстаецца аўтарытэтам.

(СЭКЦЫЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ, МАЗЫРСКАГА ГАРСАВЕТУ).

За апошнія два гады сэкцыя аховы здароўя Мазырскага гарсавету ў сваёй працы канчаткова аформілася, як масавы орган.

У працы гарсавету сэкцыя карыстаецца значным аўтарытэтам. Сэкцыя зьяўляецца яго памоцнікам, яна падрыхтоўвае пытаньні да прэзыдыуму.

За час свайго паўнамоцтва (з 17-IУ-1927 г. да гэтага часу) праведзена 34 пасяджэньні бюро сэкцыі, 38 пленумаў сэкцыі і 2 нарады прымацаваных. Сэкцыя на сваіх пасяджэньнях бюро і пленумах разглядзела 117 пытаньняў, з якіх 23 арганізацыйныя. Да кожнай лекавай установы быў прымацаваны сябра сэкцыі, які сыстэматычна наглядаў за працай той установы, да якой ён быў прымацаваны.

За ўвесь час сэкцыяй былі праведзены 3 разы агляды працы больніцы, 1 раз зразнай больніцы, 2 разы сухотнага дыспансэру і інш. лекавых устаноў.

Пры сэкцыі ёсьць санітарная камісія. За апошні час камісія сваю працу ажывіла, быў праведзен санітарны агляд хлебапякарняў ЦРК, каўбасная ЦРК, каўбасная ДОПР'у, дзе адзначана антысанітарнае становішча вышэйпамянёных устаноў, таксама быў праведзен агляд санітарнага становішча ўсіх прадпрыёмстваў гораду, рабочага пасёлку, усіх мясных крам, крам ЦРК і інш. устаноў. Праз некаторы час камісія праводзіць праверку дадзеных ёй дырэктыў. Праведзена справаздача ўсіх сяброў сэкцыі перад выбаршчыкамі.

Уся праца сэкцыі праводзілася строга па распрацаванаму загадзя каляндарнаму пляну працы. Дрэнна ў нас пастаўлена была справа з дапамогаю дома. Сэкцыя своечасова гэтым пытаньнем зацікавіліся і цяпер гэтая справа значна палепшана; замест аднаго доктара мы маем двух. Распрацавана палажэньне аб дапамозе хворым дома.

Калі трэба было запісаць доктара дамоў, дык прыходзілася ісьці ў больніцу за некалькі кілёмэтраў, а цяпер пастаўлена пытаньне аб рэгістрацыі ў цэнтры гораду. Па ініцыятыве сэкцыі была абсьледавана ў апошні месяц акруговая больніца, якая знаходзілася ў вельмі дрэнным становішчы, цяпер на апошнім пасяджэньні прэзыдыуму быў зроблен даклад абсьледавацеля і прэзыдыум АВК адпусьціў дадатковыя сродкі для палепшаньня працы больніцы.

Своечасова сэкцыяй разгледжана пытаньне пяцігадовага пляну аховы здароўя і каштарысы ўсіх лекавых устаноў. Актыўны ўдзел сэкцыя прымала ў правядзеньні трохдзённіка дапамогі хворым на сухоты, тылні аховы здароўя школьнікаў, барацьбы і прошікарлятынной вакцынацыі, праверце аплаты за вадалячэньне, культурным паходзе, аглядзе чырвоных казарм і г.д.

За паўнамоцны пэрыяд сэкцыя праводзіла на буйных прадпрыемствах (Чырвоны Кастрычнік) кансультацыі з маткамі ў доме дзіцяці.

Пляны працы амаль што выкананы на ўсе 100 проц., за выключэньнем тых пытаньняў, якія былі зьняты прэзыдыумам.

Наведваньне бюро сэкцыі 80-85 проц., пленумаў—75-80 проц., трэба адзначыць, што больш актыўнымі ў наведваньні зьяўляюцца прымацаваныя. Наогул, сэкцыя аховы здароўя мае ў сваёй працы нямала дасягненьняў, але поруч з гэтым маюцца маленькія недахопы. Сэкцыя лічыцца адной з лепшых сэкцый Мазырскага гарсавету.

Х. Саф'ян.

Адзін з лепшых.

(Бярэзінскі райён, Менскай акр.)

У Бярэзінскім райёне існуе 16 сельсаветаў, але лепш усіх працуе Багушэвіцкі сельсавет, склад якога па сацыяльнаму становішчу бядняцкі.

Дзякуючы добра пастаўленай працы, сельсавет карыстаецца аўтарытэтам сярод насельніцтва.

Праца савету праводзіцца выключна па пляну, неабходна адзначыць, што складаемыя пляны зьяўляюцца рэальнымі і жыцьцёвымі, закранае ўсе пытаньні жыцьця гэтага сельсавету.

Пытаньні на пасяджэньні прэзыдыуму і пленуме абгаварваюцца калектыўным нарадкам. Пленумы праводзяцца рэгулярна штомесячна, наведваньне пленумаў сельсавету членамі і кандыдатамі ў сярэднім каля 80 проц.

Актыў удзельнічае на пленуме ў сярэднім 15 чалавек і сялян каля 10 чал.

Актыў створан вакол сельсавету з 33 чал. Патрэбна адзначыць, што як члены сельсавету, так і весь актыў прымаюць актыўны ўдзел у абгаварэньні пытаньняў.

Масавая праца сельсавету пастаўлена добра, за апошні год праведзена агульных сходаў грамадзян—94 і сходаў беднаты—30, наказы, дадзеныя сходамі па вёсках, у большасьці сельсаветам выконваюцца.

Клясавая лінія сельсавету праводзіцца вытрымана, дапамога беднаце аказваецца, скарг на сельсавет аб неправідловым падыходзе да беднаты ня было.

На тэрыторыі сельсавету маюцца наступныя першапачатковыя сельска-гаспадарчыя аб'яднаньні: адно мэліарацыйнае т-ва з 22 чал., адно жывёлаводчаскае з 24 чал., адно бычач'е т-ва з 35 чал., адзін яўрэйскі сельска-гаспадарчы калектыў з 31 чал., адна сельска-гаспадарчая беларуская арцель з 11 чал. і адна смалакураная арцель з 88 чал. Арцелі працуюць здавальняюча.

Па сельсавету ў большасьці праспалосіца, паселковыя гаспадаркі занімаюць плошчу—220 дзес. За ўвесь час сельсавет земляўпарадкавана 350 дзес. У гэтай галіне работа сельсавету праводзіцца слаба.

Каапэрыраваньне па сельсавету праводзіцца здавальняюча, праз спажывецкую каапэрацыю каапэравана насельніцтва—96,5 пр., сельска гаспадарчую—54,5 пр., беднаты каапэравана праз спажывецкую і с.-г. каапэрацыю 82 гаспадаркі.

Пры той здавальняючa праведзенай працы каапэрацыйнымі арганізацыямі прыватнікі вымушаны былі за апошні год зачыніць 2 крамы.

Заданьні РВК па рэалізацыі розных пазык сельсаветам выконваюцца на 140 проц. Усяго рэалізавана розных пазык на суму—2100 руб.

Самаабкладаньне сельсаветам праведзена было як у мінулым годзе, так і ў гэтым на ўтрыманьне ветэрынарнага пункта. Ветпункт працуе і сродкі ад самаабкладаньня скарыстоўваюцца поўнасьцю.

У касу ашчаднасьці ўсяго ўплягнута —61 укладчык на суму—5.094 руб.

Насельніцтва на тэрыторыі гэтага сельсавету ў культурных адносінах абслугоўваецца дастаткова. Маецца беларуская сямігодка, яўрэйская школа, польская школа, адна хата-чытальня і 2 прымітыўныя хаты-чытальні.

Шляхі і масты замацаваны за населішчамі сельсавету і сіламі насельніцтва адрамантаваны 8 мастоў, засталося неадрамантаваных—4 масты.

Сувязь сельсавету з ўсімі грамадзкімі, прафсаюзнымі і партыйнымі арганізацыямі наладжана добра. П. Б.

ДЗЕСЯЦЬ ГОД КАМІНТЭРНУ.

(Артыкул генэральнага сакратара Прафінтэрну т. Лазоўскага).

У пачатку сакавіка міне дзесяць год з дню заснаваньня Камуністычнага Інтэрнацыяналу, дзесяць год барацьбы, перамог і паражэньняў. Гэта быў цяжкі час. Савецкая Расея, абкружаная з усіх бакоў ворагамі, гэраічна адбівалася ад унутранай і замежнай контрэвалюцыі. Вайна пядаўна толькі скончылася, і ў масах адбываўся глыбокі рух. Перамогшая Антанта сьвяткавала перамогу. Нямеччына і Аўстра-Вэнгрыя ляжалі ў пылу. Узяўшая верх «дэмакратыя», напалоханая ростам масавага руху, выпрапоўвала праэкты міжнароднага клясавага супрацоўніцтва.

Напалоханыя масавым рухам эўрапейскія ўрады пачалі дэкляраваць 8-мігадзінны рабочы дзень і шырокае сацыяльнае законадаўства. Сацыялістычныя ўрады зьяўляліся, як грыбы.

У гэтым руху мілёнаў, руху, які даходзіў на асобных вучастках фронту да адкрытых паўстаньняў, былі ўсе элемэнты для сацыялістычнай рэвалюцыі.

Былі аб'ектыўныя эканамічныя ўмовы, была вельмі глыбокая нянавісьць да вінавайцаў вайны ў масах. Была патрэба перавярнуць усё старое і стварыць нешта новае. У масах было жаданьне ажыцьцёвіць свае нясьпяныя патрабаваньні ў галіне сацыяльнай справядлівасьці. Было жаданьне і ўменьне змагацца за свае патрабаваньні. Але ня было аднаго—ня было суб'ектыўнага фактара—насіцеля пралетарскай рэвалюцыі.

У капіталістычных краінах ня было сур'ёзных камуністычных партый.

І вось гэты вялізарны ўздым, зьвязаны з непасрэдным скончэньнем вайны, уздым, які ўцягнуў дзесяткі мілёнаў пралетарыяў, уздым, які мог-бы прывесьці да ператварэньня капіталістычнай Эўропы ў сацыялістычную, аказаўся гістарычным неданоскам, найбольш яскравым выяўленьнем якога былі ўсякага роду сацыял-дэмакратычныя ўрады, бачыўшыя „сацыялізм" без рэвалюцыі, устанаўляўшыя ўладу пралетарыяту на асновах дэмакратыі і кааліцыі.

У муках і баёх нарадзіліся ў канцы вайны невялікія камуністычныя групы, якія паступова ператвараліся ў баявыя партыі пралетарыяту. Так былі закладзены асновы Камуністычнага Інтэрнацыяналу, так былі закладзены на поле бойкі ў пэрыяд імпэрыялістычнай вайны і непасрэдна пасьля яе скончэньня асновы міжнароднага братэрства рабочых.

Сапраўдныя камуністычныя партыі існавалі да вайны толькі ў Расеі і ў тых краінах, дзе рабочы рух быў зьвязан з рабочым рухам старой Расеі (Польшча, Латвія і г. д.). У іншых краінах левыя элемэнты знаходзіліся ўнутры сацыял-дэмакратычных партый і лічылі немагчымым арганізаванае разьмежаваньне з старой сацыял-дэмакратыяй. Вайна выявіла сілы апартунізму ў міжнародным рабочым руху, прычым, апроч расейскіх бальшавікоў і асобных груп інтэрнацыяналістаў у Расеі і іншых краінах, усе сацыялістычныя і прафсаюзныя кадры былі ўцягнуты ў вайну.

Але ў часе разьвіцьця ваенных дзеяньняў і ваеннай ідэалёгіі ў кіруючых элемэнтаў рабочага руху ў масах расло ідэёвае і арганізацыйнае процідзеяньне гэтаму ператварэньню сацыялістычнай партыі і прафсаюзных арганізацый у падсобныя зброі імпэрыялістычнай вайны. Так, у пэрыяд імпэрыялістычнай вайны, перад рабочай клясай паўстала пытаньне адносна новага Інтэрнацыяналу, і хоць Цымэрвальдзкая і Кінтальская канфэрэнцыі ня ставілі адкрыта праблему III-га Інтэрнацыяналу, гэтыя дзьве канфэрэнцыі былі бясспрэчна этапамі на шляху да стварэньня новага Інтэрнацыяналу.

У вайне і ў сацыяльных навальніцах, нарадзіўся, такім чынам, той рух, які прывёў да стварэньня невялікіх камуністычных груп і дало падставу партыі і Камуністычнай рэвалюцыі ўзяць на сябе ініцыятыву заснаваньня Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Калі глаба для ўзьнікненьня камуністычных партый была створана вайной, дык афармленьне пачалося пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі. Партыя бальшавікоў выступіла на гістарычную арэну як сіла, якая процістаўляецца ўсяму капіталістычнаму сьвету. Бальшавізм перайшоў да прапаганды дзейнічаньнем, ён паказаў, што значыць бальшавіцкая партыя.

Для рабочых усіх краін Кастрычнікавая рэвалюцыя была хоць і неспадзяванай, але роднай падзеяй.

Такім чынам, Кастрычнікавая рэвалюцыя дала вельмі моцны штуршок да афармленьня камуністычнага руху ўсіх краін і пагэтаму можна лічыць важнейшай прадпасылкай заснаваньню Камуністычнага Інтэрнацыяналу перамогу расейскага пралетарыяту ў кастрычніку 1917 г.

Камуністычны Інтэрнацыянал узьнік як орган клясавай вайны, як бязьлітасны вораг буржуазеі і сацыял-дэмакратыі. Камуністычны Інтэрнацыянал у момант свайго заснаваньня аб'яднаў гэтыя малыя партыі, але затое сярод заснавальнікаў была партыя, перамогшая рэвалюцыяй, і пагэтаму з моманту ўзьнікненьня Камуністычнага Інтэрнацыяналу Кастрычнікавая рэвалюцыя і краіна Саветаў арганічна зьліліся ў думцы шырокіх мас у Камуністычным Інтэрнацыянале.

Камінтэрн народжан Кастрычнікавай рэвалюцыяй; Камінтэрн падтрымліваў гэту рэвалюцыю і штурхаў яе наперад. Але падтрымліваць Кастрычнікавую рэвалюцыю азначала, у першую чаргу, стварыць сур'ёзныя апорныя пункты ва ўсіх капіталістычных краінах. Менавіта таму ўзьнікненьне Камінтэрну азначала палітычную дыфэрэнцыацыю ў рабочай клясе, самастойнае аб'яднаньне лепшай часткі рабочых, ідэёвае палітычнае і арганізацыйнае афармленьне партыі і рэвалюйных груп ва ўсіх краінах.

Як толькі Камінтэрн узьнік і зьвярнуўся да рабочых усіх краін, мы бачым, што гэта знайшло жывы водгук у шырокіх масах. Старыя сацыял-дэмакратычныя партыі пачалі трашчаць па ўсіх швох. У адных краінах (Францыя, Чэхаславакія) бальшасьць выказалася за Камінтэрн; такім чынам, узьнікненьне Камуністычнага Інтэрнацыяналу было сыгналам да арганізацыйнага і палітычнага афармленьня камуністычных груп і ўсіх спачуваючых Кастрычнікавай рэвалюцыі ў самастойныя камуністычныя партыі.

Мінула дзесяць год і мы можам зараз параўнаць, чым быў Камуністычны Інтэрнацыянал у момант свайго ўзьнікненьня і чым ён стаў цяпер. За гэты час камуністычныя партыі ўзьніклі за ўсіх краінах. Зараз няма ніводнай краіны ў сьвеце, дзе-б ня было камуністычных партый ці камуністычных груп. Нават у найбольш адсталых паўкалёніяльных і калёніяльных краінах арганізаваны камуністычныя партыі, якія стаяць на чале рэвалюцыйнага руху рабочых і нацыянальна-вызваленчага руху. Камінтэрн стаў сусьветнай дзяржавай, і іменна гэтым тлумачыцца тая барацьба, якую вядуць супроць Камінтэрну пануючыя клясы і іх сацыял-дэмакратычныя падсобнікі ва ўсіх краінах.

З арганізацыі, якая аб'ядная дзьве партыі і паўтара дзесятка камуністычных груп, Камінтэрн абярнуўся ў сусьветную кампартыю, якая налічвае каля 60 нацыянальных сэкцый, партыю, маючую вялізную прэсу, партыю, за якой ідуць дзесяткі мілёнаў пралетарыяў.

Рост адбываўся па двух напрамках: па лініі палітычнай і арганізацыйнай. Палітычны Камінтэрн мацнеў. Адзнакай сьпеласьці і ўзмоцненасьці Камінтэрну зьяўляецца прынятая на VI кангрэсе праграма. На лініі арганізацыйнай Камінтэрн набываў з кожным годам усё новыя і новыя партыі. Да яго далучаліся адна краіна за другой, і ён ад кангрэсу да кангрэсу заваёўваў усё новыя і новыя пазіцыі. Міжнародная рэвалюцыйная партыя стала наяўным фактам.

Маленькая арганізацыя зрабілася грознай сілай, якая супроцьстаіць усяму капіталістычнаму сьвету.

Узьнікненьне Камуністычнага Інтэрнацыяналу мае асабліва вялікае значэньне для прафэсыйнага руху ўсіх краін. Разам з Сацыялістычным Інтэрнацыяналам абанкроціўся і прафсаюзны Інтэрнацыянал. Нараджэньне Камінтэрну таксама азначала і афармленьне рэвалюцыйнага крыла прафэсыйнага руху. І зусім невыпадкова, праз год, пасьля ўзьнікненьня Камуністычнага Інтэрнацыяналу, нарадзіўся і Чырвоны Інтэрнацыянал Прафэсыйных Саюзаў. Трэба было сабраць усе рэвалюцыйныя сілы прафэсыйнага руху, трэба было аформіць той рух, які назіраўся ў нетрах прафсаюзаў. Трэба было ідэёва і палітычна выкрысталізаваць тое новае, што нарадзілася ў масах у барацьбе супроць здрадніцтва міжнароднага рэфармізму. Адгэтуль і нараджэньне Чырвонага Інтэрнацыяналу Прафсаюзаў, задачаю якога было з першых дзён яго ўзьнікненьня сабраньне ўсіх сіл для супольнай барацьбы супроць разьбіваючага прафэсыйнага руху рэфармізму.

Прафінтэрн аформіўся і склаўся як міжнародная арганізацыя толькі ў часе III кангрэсу Камуністычнага Інтэрнацыяналу, у той час, калі рэвалюцыйныя хвалі пачалі спадаць, калі выявілася, што перад авангардам пралетарыяту стаіць задача доўгачаснай барацьбы супроць капіталізму і рэфармізму. Прафінтэрн узьнік тады, калі буржуазея адбіла першыя лобавыя атакі ў капіталістычных краінах і калі трэба было перагрупоўваць свае шэрагі і заняцца, з аднаго боку, абходным рухам, а з другога боку—доўгай працай у масах, каб на чале іх зноў пайсьці ў штурм.

Прафінтэрн ня мог-бы ўзьнікнуць бяз самага актыўнага ўдзелу Камуністычнага Інтэрнацыяналу і камуністычных партый.

Ён ня мог-бы аформіцца, калі-б міжнародны камунізм гэтаму не дапамог, ён ня мог-бы ўзрасьці, калі-б не ўзрасьлі партыі, ён ня мог-бы разгарнуць сваю працу, калі-б не разгортвалася праца Камуністычнага Інтэрнацыяналу і яго сэкцый.

Дзесяць год тэрмін не вялікі, а між тым праробленa вялікая праца. Гэта праца мае тым больш гістарычнае значэньне, што яна ўцягнула ў кола ўплыву Камуністычнага Інтэрнацыяналу ня толькі мілёны рабочых, але і дзесяткі мілёнаў прыгнечанага імпэрыялізмам насельніцтва калёніяльных і паўкалёніяльных краін. Сьцяг Камінтэрну зьяўляецца ня толькі сьцягам сацыяльнага, але і сьцягам нацыянальнага вызваленьня. Гэта відаць было на працягу

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Удзел школы ў сьвяткаваньні XI гадавіны Чырвонай арміі.

У сьвяткаваньні 11-й гадавіны Чырвонай арміі нашы школы павінны прыняць самы актыўны ўдзел, паколькі школы павінны выхоўваць падрастаючае пакаленьне — як сьвядомых і актыўных абаронцаў заваёў Кастрычніка. Трэба каб школы, асабліва на вёсцы (дзе амаль не працуюць ячэйкі ТДА), зьявіліся сапраўднымі арганізатарамі шырокага сьвяткаваньня гадавіны Чырвонай арміі. Удзел у сьвяткаваньні трэба вывіць ня толькі з вучнямі сваёй школы, але ў гэта сьвяткаваньне ўцягнуць і бядняцка-сераднякцкае сялянства пры ўдзеле пераменьнікаў і дэмабілізаваных чырвонармейцаў. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на ўцягненьне ў сьвяткаваньне жанчын.

Што канкрэтна павінна зрабіць школа ў правядзеньні сьвяткаваньня? Школа павінна праз вучняў, у гутарках з сялянамі, на сходах і інш. высьветліць наша сучаснае палітычнае становішча і ролю Чырвонай арміі ў абароне нашай краіны. Асабліва трэба застанавіцца на вытлумачэньні характару будучай вайны, небясьпека ў якой яшчэ не мінавала. Трэба, каб усе працоўныя масы адчувалі, што кожны ў нашай дзяржаве павінен быць падрыхтаваным да абароны ўлады саветаў, павінен прыняць актыўны ўдзел у гэтай абароне.

У часы сьвяткаваньня гадавіны Чырвонай арміі трэба правярыць працу ячэек ТДА — што імі зроблена, якія ёсьць дасягненьні і недахопы і ўсіліць іх працу. У арганізацыі гэтых ячэек і наладжаньні іх працы вялікі ўдзел павінны прыняць школы, прычым трэба разгарнуць сапраўдную працу па ваенізацыі насельніцтва няпрызыўных узростаў: жанчын і мужчын старэй 40 год. Трэба, каб усе рабочыя і сяляне былі азнаёмлены з самымі элемэнтарнымі сродкамі барацьбы і абароны: уменьне ўладаць стрэльбай і пісталетам, ужываць процігазныя сродкі, умець аказаць першую дапамогу раненаму і інш. Трэба, каб насельніцтва было азнаёмлена і з тактыкай барацьбы нашых і варожых войск. Для падрастаючага пакаленьня ўсе гэтыя веды і навыкі павінна даць наша працоўная школа, а для дарослага насельніцтва — школа і ячэйка ТДА.

Трэба зьвярнуць асабівую ўвагу на пашырэньне і азнаямленьне насяленьня і вучняў школ з настацкай вайсковай літаратурай і нават з літаратурай элемэнтарных тэхнічных ведаў. Гэткая літаратура ў нас ужо ёсьць.

Школа павінна наладзіць выстаўкі тэй літаратуры, якая ёсьць на месцы, і вывесіць сьпіс тэй літаратуры, якая ёсьць наогул па тых ці іншых пытаньнях. Гэту літаратуру трэба папулярызаваць, чытаць у клясе з вучнямі, рэкамэндаваць для чытаньня дома.

Наогул школа павінна выявіць ініцыятыву ў пашырэньні сьвядомасьці аб задачах Чырвонае арміі, у арганізацыі насельніцтва ў ячэйкі ТДА, у наладжаньні самае справы сапраўднае ваенізацыі насельніцтва і вучняў, у папулярызацыі вайсковых ведаў, літаратуры, у падняцьці належнага настрою, дзеля чаго арганізаваць успаміны ўдзельнікаў грамадзянскай барацьбы і інш.

Божны грамадзянін рабоча-сялянскай Беларусі павінен ведаць, што дзякуючы Чырвонай арміі магчыма мірная вольная праца на карысьць працоўнай грамады.

В. С—іч.

Дапамагаем беднаце.

(2-я сямёхгодка, Слуцак).

Да гэтага навучальнага году бедным вучням аказвалася дапамога толькі падручнікамі. Іншай дапамогі амаль што не аказвалася. У гэтым годзе пытаньне паўстала са ўсёй яскравасьцю. Першымі адгукнуліся бацькі. На сродкі, сабраныя бацькамі, былі пашыты адному вучню чаравікі і вучаніцы—бялізна і сукенка. Для вучняў малодшых груп набыты атрамант, каб яго не насілі з дому. Але гэтай дапамогі было мала.

Толькі з другога паўгодзьдзя магчымасьць дапамагчы бедным вучням павялічылася. Гарадзкім саветам з фонду беднаты было адпушчана 65 руб., са школьных сродкаў—каля 40 руб. Адгукнуліся і настаўнікі, якія на падпісным лісьце сабралі каля 20 рублёў. Такім чынам назбіралася каля 150 руб.

Беднаты ў школе многа, а сродкі —зусім невялікія. Школьным саветам была вылучана камісія з двох настаўнікаў і аднаго вучня, якая павінна была высьветліць, хто з вучняў найболей бедны і чым яму трэба аказаць дапамогу. Вынікі абсьледваньня былі абгавораны на пасяджэньні школьнай рады разам з бацькоўскім камітэтам. Сродкаў аказалася замала, каб задаволіць імі ўсіх бедных вучняў.

У першую чаргу ўхвалілі дапамагчы самым бяднейшым вучням. Для іх куплена 8 пар чаравікаў, пашыта 10 пар бялізны, 2 цёплыя сукенкі, 1 паліто і шапка і 3 вучням дадзены сродкі на яду.

Гэта дапамога хоць і значная, але ёю забаўлены толькі невялікі лік беднаты. У далейшым і школе, і бацькоўскаму камітэту трэба задумацца над тым, каб адпускаць больш сродкаў і дапамогу беднаце зрабіць больш сыстэматычнай, а не выпадковай.

М—ц.

Добры будынак ахвяраван на цэглу.

(Клімавіцкі р., Магілеўшчына).

Яшчэ ў 1927 г. Клімавіцкі РВК пачаў будаваць новае памяшканьне пад Мілаславіцкую школу 7-годку. Збудавалі зруб, зарыфовілі дах і на гэтым спынілісь: грошай не хапала. Так і стаяў гэты зруб да гэтага часу без фундаменту і бяз крышы. Але зараз РВК узяўся за працу і дзеля пачатку рашыў вясной падвесьці пад школу фундамент. Для фундаменту, як вядома, патрэбна цэгла, і РВК пастанаўляе: зламаць дзеля гэтага мураваны дом у былым маёнтку Юзенава (за 6 клм. ад Мілаславічы).

Дом гэты вельміялікі (80 на 40) трохпавярховы (адзін паверх падвальны) і пры ім, за выключэньнем закоў, у ім усё ў парадку. Падлога паркетная, штукатурка аблупілася, лесьніца спраўная, вечы не збураны,—адным словам,—толькі ўстаўкны і жыві.

Зламаць гэткі дом на цэглу—праступна. Пры вазначым рамонце яго можна прыстасаваць пад што хочам. На добры лад Клімавіцкаму РВК ня трэба было будаваць новае памяшканьне пад школу, а проста адрапараваць гэты дом. Сродкаў на гэта пашло-б у 10 разоў менш, а памяшканьне па сваёй прыгоднасьці было-б у 10 разоў лепшым.

Але зробленага не адробіш.

Трэба саюзу працаўсьветы паклапаціцца ўвяць гэты дом пад сваё ўладаньне і зрабіць у ім дом адпачынку для сяброў саюзу. Акалячаючы мясцовасьць як нельга лепш спрыяе гэтаму: кругом зялёныя сасновыя лясы, каля самага дому возера і г. д.

У кожным разе дом, які каштуе шмат тысяч, ламаць на цэглу недапушчыма.

Санітар.

„НЯМА ПАДСТАЎ ДЛЯ ЗВАЛЬНЕНЬНЯ".

(Аршанская акруга).

Вось ужо 5 год, як у Пугляеўскай школе, Аршанскага раёну і акругі працуе настаўніца Макарава. Юбілей можна было-б адсьвяткаваць, скажуць адны. За што, —спытаюцца другія. Хіба за тое, што настаўніца Макарава ў працягу 5 год як зьвер адносіцца да сялянскіх дзяцей? Зьбівала іх аж да крыві і вывезьвалася, як толькі хацела. Напрыклад, аднаго хлопчыка, Шчарбакова Ляксея, Макарава біла да таго, што ён пачаў крычаць. Што-ж гэта за настаўніца? Адчыніла дзьверы і выпіхнула аднаго хлопчыка з клясы, нібы кацяня.

Ды як-жа ня біць? Гэта-ж самі бацькі колькі разоў казалі: «біце нашых дзяцей, гнаніце лайна, каб былі паслухмяныя». Незаволеныя, праўда, скардзіліся, але дзе-ж там. Муж Макаравай—Загарэльскі сам сэкратар сельсавету. Пойдзеш скардзіцца, а ён пагражае: «будзеце скардзіцца, дык настаўніца ня будзе вучыць вашых дзяцей і выганіць з клясы».

І сапраўды выганяла. Дужа проста. Возьме за руку ці за валасы, раскруціць, кіне аб падлогу, дзіцяцё заенчыць, само выскачыць з клясы—вось і ўсё.

Ды толькі ня ўсім. Звольнілі мужа з пасады сэкратара за ўсякія злачынствы, выкрытыя ў мясцовай газэце. Заварушыліся сяляне. Падалі ў раённую і акруговую інспэктуру штук 40 заяў аб дзейнасьці Макаравай. Прыехаў на рэвізію і акруговы інспэктар т. Бараноўскі. Што-ж? Пакруціўся ў школе, знайшоў, што... факт біцьця быў, але... настаўніца ўрачыста абяцала яму больш ня біць. І далей... «няма падстаў для звальненьня з пасады!» Так сказаў у выніку акруговы інспэктар.

А праз тыдзень пасьля гэтага, 26 студзеня г. г., настаўніца цягала дзяўчынку калеку, з тубэркулёзам левай нагі, Ліду Барысэвіч па клясе, без кастылёў і паставіла яе на паўгадзіны перад клясай таксама без кастылёў.

Добры, дужа добры акруговы інспэктар т. Бараноўскі. Якая, урэшце, нас цікавіць, думка акруговага пракурора наконт усіх гэтых спраў?

Цыбуля.

ДЗІЦЯЧЫ ПРЫЕМНІК У СТАДОЛЕ.

Ад Полацкага дзіцячага прыемніку на працягу 2-х мясяцаў (лістапад-сьнежань 28 г.) атрахівалі рукі і Дзіцячая Камісія і Інспэктарыят Асьветы. Першая ўстанова казала: я перадаю прыемнік, а Інспэктарыят Асьветы і гаварыць не хацеў—я яшчэ ня прыняў і нічога ня ведаю. Прыемніку ня то што дзяцей прымаць і выхоўваць, а ўпору было самому пайсьці жабраваць. Цяпер-жа, калі пытаньне з перадачай высьветлена, у інспэктарыяце няма сродкаў па каштарысу, ды і наогул «вам там няма чаго рабіць» — адказваў Інспэктарыят, калі да яго зварачваюцца працаўнікі са скаргамі на сваё жыцьцё-быцьцё.

І сапраўды, што рабіць?

Усё памяшканьне прыемніку занята ложкамі для дзяцей, няма віднога пакою, дзе можна было б правесьці якую-небудзь працу. Дзеці сьпяць па двое на адным ложку. Ложкаў не хапае, ды і няма дзе іх паставіць. Няма нават такой мэблі, як зэдлікі. Калі выхавацельніца займаецца, дзеці вымушаны сядзець на ложках, а гэта вядзе да балаўства, некаторых цягне спачынуць, а іншы ўступае ў спрэчкі з настаўніцай: «Што вы нас вучыце, калі мы галодныя». І няма чаго на гэта адказаць, бо сапраўды, нельга-ж накарміць 60 дзяцей, калі сродкаў адпушчаецца ўсяго на 40 па 30 кап. у дзень. Ды і ежа часам ня дужа то ў глотку лезе — кухня і сталоўка ў летнім будынку, так сказаць—„паша горніца з надвор'ем ня спорыцца".

Сьцены і столь заўсёды пакрыты лёдам, які ў часе абеду ад пары, якая ідзе са стравы, растайвае і капае ў талеркі. Праўда, ад гэтага страты няма, але ў некаторых дзяцей губляецца апэтыт, так часам каторы і застанецца не пад'еўшы.

Грып, ангіна і іншыя хваробы добра знаёмы кожнаму выхаванцу, бо няма ізалятара ня толькі для хворых дзяцей, а і для ваназа паступаючых з вуліцы—надворны агляд у гар. амбуляторыі замяняе ізалятар. Магчыма, амбуляторны агляд і добры, але хто дасьць гарантыю, што новы выхаванец не прынясе новай хваробы?

Так жывуць дзеці, і можна ўявіць сабе карысьць працы працаўнікоў і вынікі выхаваньня.

Ня могуць пахваліцца сваім жыцьцём і служачыя прыемніку: загадчыца, тры выхавацельніцы, кухарка, прачка і вартаўнік.

Выхавацельніцы (ня трэба гаварыць пра ўмовы працы) працуюць заместа 6 гадзін—7 гадзін у дзень. Астатнія 3 гадзіны ў суткі працуе загадчыца звыш сваёй асноўнай працы. Выхадного дню яны ня маюць, і за гэтыя дні, а таксама за звышнормавую працу ніякай кампэнсацыі не атрымліваюць. Прачка працуе ў тым-жа будынку, дзе і сталоўка—ад печы грэе, а са ўсіх бакоў сьцюжа вее. Бялізна, пакладзеная ў вар, амаль што зараз-жа зьмярзаецца. Плача баба—рукі ад гарачай вады і сьцюжы да крыві пашчапаліся.

Кухарка працуе ў тым-жа будынку і ў тых-жа ўмовах.

Прачка і кухарка, ня гледзячы на цяжкасьць знайсьці сабе працу ў Полацку, ставяць пытаньне аб сваім звальненьні, а хто пойдзе на іх месца?

Многія мясцовыя працаўнікі толькі разводзяць рукамі і адзін у другога пытаюцца: Што-ж рабіць? Дзе выйсьце? Чакаюць лета.

Пытаньне ясна. Акрыпраўленьне саюзу і Інспэктарыят Працы павінны зараз-жа, неадкладна больш рашуча паставіць пытаньне перад належнымі органамі аб прадастаўленьні дзіцячаму прыемніку апавядаючага будынку.

Жыгун.

Дайце стоража.

(М. Крайск, Плешчаніцк. р.)

Крайская 4-хгадовая школа зьмяшчаецца ў двух аграмадных будынках. Дзеля абслугоўваньня яе трэба сталы мужчына. Вучняў бывае ў школе штодня каля 150 чалавек. Да гэтага году ў школе быў сторож. Але захацелася Плешчаніцкаму рыку пасадзіць у школу хворую жанчыну. Добра ёй жылося ў плешчаніцкім нарэоме і праца лёгкая была ёй, паводле яе здароўя. Аднак, рык зьняў яе там з пасады і прыслаў у крайскую школу ды яшчэ, ці праўда, ці не, кажуць, даў ёй 60 руб. за пераезд, у той час, як фурманка каштуе ўсяго 2 руб.

Не пасьпела яна прыехаць у Крайск, як зараз-жа паехала ў Менск на аперацыю. Затым ізноў прыяжджае хворая, зусім няздольная да тэй цяжкай працы, якую трэба рабіць у школе. А працы шмат.

Дзеці трасуцца ў клясах ад сьцюжы, а дроў новен хлеў. Ды што з таго, калі настаўнік і акты складаў аб некарадках, а яна сходзіць да доктара, возьме ад яго запіску, што хворая, што здароўе не дазваляе дровы насіць, або рана ўставаць.

Так і сядзяць нашы дзеці ў сьцюдзёных нямытых клясах, часта нават без вады: шмат хто пакідаў хадзіць у школу праз тое, што там сьцюдзёна. Трэба на гэта зьвярнуць увагу.

Няхай рык дасьць школе здаровага стоража.

Вясковы.

Узмацнім падрыхтоўку да вясновай сяўбы.

Саюз сельска-гаспадарчых і лясных рабочых--на барацьбу за ўраджайнасьць.

(*Гутарка з старшынёй ЦП саюзу сельаслесрабочых тав. Вайтэнкавым*).

НАШ САЮЗ ПАВІНЕН БЫЦЬ У ПЕРШЫХ ШЭРАГАХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА УРАДЖАЙ.

— Усім арганізацыям і ячэйкам нашага саюзу,—сказаў т. Вайтэнкаў, —запрапанавана адвесьці вясеньняй сяўбе максімум увагі. Наш саюз павінен так паставіць працу ў надыходзячую вясеньнюю сяўбу, каб дабіцца арганізаванасьці, правільнае растаноўкі агранамічных сіл, рацыянальнага скарыстаньня ўсіх сродкаў. Нам трэба дабіцца поўнага выкананьня вызначаных задач. А мы ставім задачай: навысіць ураджайнасьць у савгасах на 17 пр., у калгасах на 12 проц. і ў сялянскіх гаспадарках на 7 проц.

Выходзячы з гэтых мэт, прэзыдыум ЦП саюзу даў шэраг дырэктыў па падрыхтоўцы да сяўбы—у савгасах, калгасах і па лініі сялянскіх гаспадарак. Ва ўсіх савгасах да 15 сакавіка на вытворчых нарадах будзе абмяркоўвацца шэраг практычных мерапрыемстваў, як загатоўка гатункоага насеньня, выкарыстоўваньне торфу, попелу, падрыхтоўка с.-г. машын, меры па падвышэньню прадукцыйнасьці жывёлаводзтва. Належная ўвага павінна быць зьвернута вытворчымі нарадамі на распрацоўку пытаньняў, зьвязаных з павялічэньнем вытворчасьці і якасьці працы і наогул з рацыянальным скарыстаньнем рабочае сілы.

Дзеля большай папулярызацыі сяўбы арганізуецца спаборніцтва паміж паасобнымі савгасамі; будзе праводзіцца шырокая перакліч на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне сяўбы праз друк, радыё-газэту і шляхам арганізацыі мітынгаў-перакліч паміж суседнімі савгасамі. За лепшае правядзеньне сяўбы і ўцягненьне ў гэту справу шырокіх колаў членаў саюзу будуць выдавацца прэміі.

Вялікую ўвагу мы зварачваем сёлета на калгасы. Нашым саюзным арганізацыям, галоўным чынам, рабочым калектывам савгасаў і сэкцыям спэцыялістаў запрапанавана ўсямерна дапамагаць калгасам у арганізацыі, агрыкультурным шэфствам над новымі не акрыяўшымі ячэйкамі калгасамі. Гэта дапамога павінна выразіцца ў устанаўленьні правільнага севазвароту, замацаваньні лепшых гатункаў культур. У калгасы трэба перанесьці лепшыя вынікі і прыклады гаспадарчае работы саўгасаў, асабліва па паляводзтву і жывёлаводзтву.

ЗА ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ НА СЯЛЯНСКІХ ПАЛЕТКАХ.

Наш саюз зварочвае сёлета вялікую ўвагу на падвышэньне ўраджайнасьці сялянскіх гаспадарак. Усе нашы саюзныя арганізацыі і культустановы будуць праводзіць сярод працоўнага сялянства шырокае растлумачэньне задач па падняцьцю ўраджайнасьці. Мы ставім перад савгасамі задачу праводзіць у такім напрамку агрыкультурныя работы, каб апошнія маглі ўплываць на калектывізацыю сялянскай гаспадаркі і наогул узьдзейнічаць на павялічэньне ўраджайнасьці і павялічэньне таварнасьці яе.

Дзеля павялічэньня ўраджайнасьці на сялянскіх палетках мы прапануем праводзіць па савгасах вытворчыя канфэрэнцыі бядняцка-сераднякцкага сялянства вакольных вёсак. Адначасна з гэтым запрапанавана ўстанавіць шэфства над усімі бядняцка-сераднякцкімі гаспадаркамі з боку савгасаў і калгасаў.

МЫ РАСПАЧЫНАЕМ ПРАВЕРКУ ПАДРЫХТОЎКІ.

ЦП запрапанаваў усім спэцыялістам сельскай і лясной гаспадаркі прыняць чынны ўдзел у надыходзячай сяўбе. Усе лясьнічыя, памоцнікі іх і аб'езчыкі павінны ня менш аднаго разу ў месяц зрабіць даклад па пытаньню ўраджайнасьці ў бліжэйшым пасёлку, або вёсцы. Мы далі дырэктыву, каб усе каморнікі пасылалі ў вёскі, у якіх праведзена землеўпарэдкаваньне, лісты з парадамі аб павялічэньні ўраджайнасьці.

У гарадох-жа на рабочых сходах асобныя тройкі з спэцыялістаў будуць чытаць лекцыі аб задачах вясеньняй сяўбы. Па жаданьню рабочых сходаў спэцыялісты супольна з шэфамі будуць выяжджаць у падшэфныя вёскі.

Дзеля праверкі падрыхтоўкі на мясцох, у хуткім часе выяжджаюць камісіі з прадстаўнікоў ЦП саюзу, Белсельтрэсту, упаўнаважаных Белсельтрэсту і рабочых савгасаў. У тых савгасах, дзе падрыхтоўка будзе праводзіцца слаба, кіраўнікі савгасаў будуць зьняты з работы і аддавацца пад суд.

Сялянская пастанова аб падняцьці ўраджайнасьці.

(Чавускі раён, Менскай акругі).

Сёньня і хата-чытальня радуецца. З самага раньня барадачы на сходку прыходзяць з самых далёкіх пасёлкаў, а з вёскі Благава, дык як адзін усе, здаецца, прышлі. Магчыма і сход хутка адчыніць, каб яго сёньня раней скончыць.

Старшыня сельсавету т. Цясёнкаў адчыніўшы сход сказаў, што сёньняшні сход вынаходзіцца ўрачыстым сходам для нас сялян, бо на гэтым сходзе мы будзем разглядаць пытаньне аб падняцьці ўраджайнасьці на нашых палёх і аб зернаачышчальным абозе, які ўжо працуе. Сход абраў прэзыдыум. Па першаму дакладу выступіў настаўнік Бічукоў, які добра растлумачыў нам, што ў СССР і БССР неабходна падняць ураджайнасьць у бліжэйшыя 5 год ня менш як на 30-55 проц.

Па дакладу сяляне задавалі шмат пытаньняў. У спрэчках прымалі ўдзел амаль што ўсе прысутныя на сходзе. Выказваліся аб тым, як падняць ураджайнасьць, гаварылі, што па вёсках і пасёлках шмат яшчэ і такіх гаспадароў, якія не дазваляюць уводзіць што-небудзь новае ў сваю гаспадарку, напрыклад, калі пасеем капюшыну ці лубін, дык яго зьнішчаюць жывёлай тыя гаспадары, якія ня хочуць уводзіць нічога новага ў сваю гаспадарку. Вось дзякуючы такім ворагам цяжка праводзіць працу па падняцьцю ўраджайнасьці.

Пасьля доўгіх і дзелавых спрэчак агульны сход аднагалосна пастанавіў, каб кожны гаспадар абавязкова прачышчаў сваё насеньне, засяваў лубін для ўгнаеньня, заёў засеў траў, для чаго абавязаць кожнага гаспадара здабываць насеньне канюшыны праз сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы, па меры магчымасьці, для засеву азіміны. Адвёў частку пару пад заняты пар, на якіх ёсьць рознае зялёнае ўгнаеньне.

Сход таксама прыняў пастанову аб тым, каб павесьці рашучую барацьбу з усякімі патравамі, для чаго ўстанавіць штраф за патраву. Штрафы спаганяць даручыць сельсавету, якія за кармавы кошт зварачаць пацярпеўшаму, а іншае аддаваць на карысьць бяспрытульных дзяцей і арганізацыю пажарнай дружыны.

Сход вынаходзіўся да партыйнай ячэйкі і хатніка, каб яны выходзілі на месца ў пасёлкі і праводзілі гутаркі з гаспадарамі наконт арганізацыі калектыўных гаспадарак, бо беднота яшчэ зусім ня ведае, што такое калектыў і як ён арганізоўваецца і ў сельсавеце яшчэ няма ніводнага калектыву, куды бы беднота магла сходзіць і паглядзець што гэта такое.

В. М. Чамаданаў.

Ці ня можна адтэрмінаваць сяўбу?

(Рагачэўскі раён, Бабруйскай акругі).

Ня гледзячы на тое, што райвыканкомам складзен плян зернаачышчэньня, які разасланы яшчэ два месяцы таму назад, але адбітку ў практыцы ніякага гэты плян не знайшоў.

Калі Асаўніцкаму сельсавету па пляну патрэбна было прыступіць да ачысткі насеньня 1 сьнежня, дык прыступілі толькі ў студзені месяцы, ды і то ня вельмі ахвотна, бо сяляне прызвычаены ачышчаць як ужо трэба выяжджаць на поле.

Якія-ж прычыны, што так позна распачалі ачышчэньне?

Калі В. Крышынаўскі сельсавет паслаў фурманку за абозам, дык Асаніцкі сельсавет адказаў, што ачышчэньне адтэрмінавалі, мабыць і сяўбу можна адтэрмінаваць, а член В.-Крушынаўскага сельсавету Старавойтаў заявіў, калі яму прапанавалі прывезьці машыны.

— На якога чорта гэтыя машыны, бяз іх абойдземся.

Пакуль што падрыхтоўка ні з месца.

К.

Ачышчаем насеньне.

(Рагачэўскі р., Бабруйскай акр.).

Толькі за апошнія дні, дзякуючы адпаведнаму нажыму з боку вышэйстаячых устаноў, справа зернаачышчэньня пачала хутка пасоўвацца.

Так, у Асоўнікскім с-савеце ўжо ачышчана 3.000 пуд. рознага насеньня. Дзякуючы растлумачальнай працы агранамі, якая праводзіла с-г. курсы ў межах с-савету, ачыстка была нябывалая, амаль што кожны селянін адсартываў сваё насеньне.

Былі выпадкі, калі зернаачышчэньне ў рэлігійныя сьвяты ішло поўным ходам.

Я. Крушына.

УХАБЫ НА ШЛЯХОХ ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ.

(ГОМЕЛЬСКАЯ АКРУГА).

I. ЛІЧБЫ.

Установамі ліквідацыі няпісьменнасьці па Гомельскай акрузе на 1-га студзеня г. г. ахоплена 13721 няпісьменных і 6979 малапісьменных, усяго 20.700; сюды не ўвайшлі ахопленыя сыстэмаю індывідуальнага навучаньня.

Выходзячы з гэтых зьвестак, мы маем у адносінах няпісьменных выкананьне пляну на 75 проц., а ў адносінах малапісьменных—на 192 проц. Лічба нібы здавальняючая, плян амаль выкананы, калі-б вучняў лікпунктаў і школ малапісьменных удалося затрымаць да канца вучэбнага году, калі-б так-званыя ўдарныя групы былі ахопжены навучаньнем поўнасьцю.

Між тым лічбы і факты выклікаюць некаторую небясьпеку.

Кожнаму вядома, што ліквідацыя няпісьменнасьці ў наш час, у час абвастраньня клясавае барацьбы, зьяўляецца пытаньнем двойчы палітычным. Неабходна ўзброіць граматаю бедняка і батрака ў вёсцы для барацьбы іх з кулаком і прыцягнуць да справы сацыялістычнага будаўніцтва элемэнт, які хістаецца, у горадзе—вось палітычны зьмест праблемы ліквідацыі няпісьменнасьці.

Гэтая важнейшая і адказьнейшая праца можа быць выканана пры ўмове ўдзелу ў ёй усіх грамадзкіх і культурных сіл акругі.

Ці маем мы такое разуменьне задач справы ліквідацыі няпісьменнасьці, будзем бачыць з далейшага.

Дырэктывамі партыйных і савецкіх органаў асабліва падкрэсьлівалася неабходнасьць поўнага ахвату ўстановамі ліквідацыі няпісьменнасьці батракоў, дэлегатак, дапрызыўнікаў, членаў калгасаў і сельска-гаспадарчых арцеляў. З гэтых груп навучаньнем ахоплена: батракоў разам з сельска-гаспадарчымі рабочымі 1181 (каля 30 проц. агульнага ліку няпісьменных гэтае групы); дэлегатак—296 (ці 21 проц. агульнага ліку няпісьменных дэлегатак); дапрызыўнікаў—208 (каля 40 проц. агульнага ліку няпісьменных); сяброў калгасаў і сельска-гаспадарчых камун, арцеляў—262 (зусім нязначны лік); зусім нязначны ахоп сяброў сельска-гаспадарчае і саматужна прамысловае кааперацыі; беднаты ахоплена 5964 ч. Сюды не ўваходзяць лічбы па ўстановах ліквідацыі малапісьменнасьці.

Выходзячы з гэтых даных, мы бачым, што нашы ўстановы па ліквідацыі няпісьменнасьці на сёнешні дзень зьяўляюцца серадняцка-бядняцкімі, што ў справе ахопу вышэйзначаных груп навучаньнем ня ўсё зроблена. Патрэбна «маленькая» перастановачка; трэба зараз-жа выправіць, пакуль ня позна, гэты буйны недахоп хоць-бы ў адносінах дзьвёх груп—дэлегатак і дапрызыўнікаў.

Апрача таго, перад установамі па ліквідацыі няпісьменнасьці стаіць задача тэрміновага, нездкладнага ахвату навучаньнем няпісьменных членаў новаабраных саветаў (у сярэднім па акрузе яны складаюць 12 проц.).

Калі-ж да гэтых лічбаў дадаць яшчэ нездавальняючае наведваньне заняткаў і значны процант адсеву, дык малюнак стану ліквідацыі няпісьменнасьці ў акрузе прымушае забіць трывогу.

Палажэньне ў гарадох ня лепшае. Ахват няпісьменных па нашых буйнейшых прадпрыёмствах акругі (Добруш, Нова-Беліца, Рэчыца) вельмі нязначны, пры наяўнасьці вялікай колькасьці няпісьменных. Тут мы маем поўнае неразуменьне палітычнага зьместу працы ліквідацыі няпісьменнасьці, упартае нежаданьне выконваць дырэктывы партыйных органаў у гэтай галіне. Нават апошнія добрускія падзеі, як відаць, нічому не навучылі дабрушан.

Вышэйпададзеныя факты сьведчаць, што справе ўкамплектаваньня ўстаноў па ліквідацыі няпісьменнасьці ня была аддана належная ўвага з боку ўсіх арганізацый, ад якіх мы мелі права чакаць дапамогі і зацікаўленасьці.

II. ФАКТЫ.

Недаацэнку важнасьці ліквідацыі няпісьменнасьці мы маем з боку часьці **райкомаў і вясковых ячэек** КП(б)Б (Церахоўка, Чачэрск і інш.). З боку іх аддаецца гэтай рабоце **недапусьціма мала ўвагі**; адсутнічае кіраўніцтва, адсутнічае праверка; грамадзкасьць у памянёных раёнах не мабілізавана вакол пытаньняў ліквідацыі няпісьменнасьці. Нават ёсьць такія раёны, дзе яшчэ не афармлены раённыя саветы т-ва «ПН».

Камсамол, які павінен быў зьявіцца застрэльшчыкам у гэтай справе, у шэрагу раёнаў праяўляе **абыякавыя адносіны**. Зусім адсутнічае праверка ўзятага камсамолам абавязацельства: кожны пісьменны навучы няпісьменнага; культпаход па нашай акрузе, у гэтай важнейшай часьці, ня даў жаданых вынікаў.

Пастановы 8-га зьезду прафэсыянальных саюзаў і дырэктывы АСПС, мабыць, не абавязковы для нашых **прафэсыянальных арганізацый**. Апошнія ў пытаньнях ліквідацыі няпісьменнасьці сярод членаў сваіх саюзаў праяўляюць **панскую абыякавасьць**. Ускладаючы надзеі на органы народнае асьветы, яны зусім ня цікавяцца пытаньнямі ахопу няпісьменных членаў саюзаў навучаньнем, наведваньнем заняткаў, пастаноўкаю вучобы. Асабліва падкрэсьліваецца нядбайнасьць да справы ліквідацыі няпісьменнасьці **з боку залінейных чыгуначных арганізацый**.

Частка прафэсыянальных арганізацый яшчэ не патурбаваліся, каб такія-сякія процанты ад культфонду адлічыць на справу ліквідацыі няпісьменнасьці.

Каапэрацыя Гомельшчыны прымае дастатковы ўдзел у справе ліквідацыі няпісьменнасьці нават матар'яльна (Спажывсаюз, Палессельсаюз, саматужна-прамысловая каапэрацыя); але і тут ёсьць „дэзэртыры", а мо' ляпей сказаць «зайцы»: Гомельскі ЦРК, Гомельскае транспартнае спажывецкае таварыства яшчэ да гэтага часу не ўнясьлі свае долі на гэтую важнейшую справу. Пісалася і гаварылася аб гэтым дастатковым, зараз трэба добра прышчаміць «зайцам» хвост, а мо' трэба таму-саму і вушы падрэзаць.

Райвыканкомы ў пачатку вучэбнага году абмяркоўвалі на сваіх пасяджэньнях пытаньні ліквідацыі няпісьменнасьці (сетка, бюджэт), але потым аб гэтай справе забыліся: у далейшым ня было з іх боку праверкі ахвату, ня былі даны сельсаветам указаньні аб дапамозе і ўдзеле з іх боку. У выніку гэтага сельсаветы да апошняга часу яшчэ ня маюць ня то што дакладнага, але і прыблізнага вучоту няпісьменных, зусім ня цікавіліся пытаньнямі ўкамплектаваньня і прыцягненьня ў лікпункты ўдарных груп, пытаньнямі наведваньня заняткаў. Мы чакаем рашучага пералому ў данай справе ад новаабраных сельсаветаў.

У шэрагу акруг Беларусі і пунктаў Саюзу ў бягучым вучэбным годзе рашаючую ролю ў справе мабілізацыі грамадзкае думкі, ахвату значнай колькасьці няпісьменных адыграла **студэнцтва** (камвузы, савпартшколы, тэхнікумы) і вучні старэйшых груп школ узьвышанага тыпу. Гомельская акруга мае дастатковы лік гэткіх устаноў, але-ж яны засталіся ў баку ад гэтае вельмі важнае і для грамадзкасьці і для іх саміх працы.

Усебеларуская савпартшкола, якая рыхтуе арганізатараў палітасьветпрацы, ня вылучыла і пары студэнтаў для арганізацыі гэтае працы. Беларускі пэдагагічны тэхнікум вылучыў дзесяткі тры студэнтаў з вялікім спазьненьнем і то пасьля шэрагу ультыматумаў. Пэдагагічная рада тэхнікуму і не падумала аб кіраўніцтве працаю гэтых студэнтаў. У апошні час, вярнуўшыся з водпуску, палова студэнтаў адмаўляецца ад гэтае працы, што прымусіла фракцыю савету „ПН" зьвярнуцца са спэцыяльным лістом у адпаведныя партыйныя ячэйкі.

Чачэрская школа II ступені палец аб палец ня ўдарыла, каб чым-небудзь дапамагчы ў гэтай важнейшай справе, ня гледзячы на шэраг указаньняў.

Ёсьць, вядома, і добрыя прыклады. Сюды трэба аднесьці Бабчынскую школу II ступені, вучні якой ахапілі навучаньнем 189 няпісьменных.

Такім чынам, справа ліквідацыі няпісьменнасьці праходзіць ва ўмовах няўважлівых адносін да яе з боку значнай часьці грамадзкіх арганізацый. **Няма грамадзкае ўвагі, няма арганізаванае грамадзкае дапамогі справе ліквідацыі няпісьменнасьці—гэтай дзейнай зброі клясавага наступленьня.**

Ня лепей справа стаіць і з метадычным кіраўніцтвам. Пытаньні ліквідацыі няпісьменнасьці або зусім не абмяркоўваюцца на пасяджэньнях раённа-пэдагагічных рад, або адносяцца на канец пасяджэньняў і прапрацоўваюцца насьпех. Школьна-пэдагагічныя рады і школы стаяць у боку ад справы ліквідацыі няпісьменнасьці. Габінэты-ж ліквідацыі няпісьменнасьці, як новыя арганізацыі, не змаглі яшчэ ахваціць сваім **кіраўніцтвам** досыць густую сетку ўстаноў па ліквідацыі **няпісьменнасьці**. Большасьць працаўнікоў асьветы і нават акруговае праўленьне працасьветы глядзяць на справу ліквідацыі няпісьменнасьці, як на малаважную справу, як на справу, якая не вымагае асаблівай кваліфікацыі і падрыхтаванасьці, як на справу, з якою справіцца кожны. У выніку такога погляду настаўнікі, што працуюць ва ўстановах для ліквідацыі няпісьменнасьці, да заняткаў не падрыхтоўваюцца, выгворчых і рабочых плянаў не складаюць, і самая работа праходзіць **бязсыстэмна і бясплянава**. Газэты ў працы не выкарыстоўваюцца; адсутнічае праца па ўцягненьню вучняў установаў для ліквідацыі **няпісьменнасьці** ў грамадзка-палітычныя арганізацыі: у працу сэкцый сельсавету, ў працу хаты-чытальні, чырвонага кутка, у працу ячэйкі «Проч няпісьменнасьць», Асавіяхіму і інш. А адсюль—нездавальненьне з боку вучняў заняткамі, а далей і адсеў і нездавальняючае наведваньне; адсюль-жа вынікае і тое палажэньне, што ўстановы для ліквідацыі няпісьменнасьці не карыстаюцца аўтарытэтам у насельніцтва.

Словам, і з боку настаўніцтва адносіны да справы ліквідацыі няпісьменнасьці толькі **спагадлівыя**.

III. ВЫВАДЫ.

Рэзка асуджаючы панскія абыякавыя адносіны да справы ліквідацыі няпісьменнасьці з боку прафэсыянальных арганізацый, асабліва залін

Ніводнага рабочага, служачага і селяніна без ашчаднае кніжкі!

АДОЗВА
МЕНСКАГА АКРУГОВАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ ДА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ МЕНШЧЫНЫ.

За апошнія гады мы дабіліся значных посьпехаў у галіне пашырэньня і пераабсталяваньня нашай прамысловасьці і ўздыму сельскай гаспадаркі. Наша капітальнае будаўніцтва в году ў год павялічваецца, праводзяцца шырокія мерапрыёмствы ў напраму палепшаньня сельскай гаспадаркі, расьце колькасьць больніц, школ і іншых навучальных устаноў.

Ня гледзячы на вялізарныя посьпехі ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі, мы адчуваем труднасьці, якія выцякаюць з нашага росту.

Для вымкчэньня гэтых труднасьцяй і найбольшага здавальненьня патрэб працоўных мас трэба тэмп індустрыялізацыі нашай краіны паскорыць і ўзмацніць капітальнае будаўніцтва. У сувязі з гэтым ўрадам намечаны шырокія пляны будаўніцтва новых фабрык і заводаў, перабудова сельскай гаспадаркі і мерапрыёмствы па падняцьцю яе ўраджайнасьці, будаўніцтва новых школ і іншых сацыяльна-культурных устаноў.

Ажыцьцяўленьне намечаных плянаў, у чым зацікаўлены ўсе працоўныя Саюзу ССР, патрабуе вялізарных сродкаў. На дапамогу замежных капіталістычных дзяржаў нам разьлічваць, вразумела, нельга, і ўсё наша будаўніцтва нам трэба праводзіць сваімі ўласнымі сіламі.

Такое становішча высоўвае неабходнасьць максымальнага скарыстаньня на патрэбы індустрыялізацыі ўсіх сродкаў, якія ёсьць у краіне. У сувязі з гэтым неабходна, каб побач з тымі сродкамі, якія выдзяляюцца ўрадам на перабудову і разьвіцьцё народнай гаспадаркі, былі на гэтыя патрэбы ўцягнуты і вольныя сродкі насельніцтва.

Выпушчаныя нядаўна дзяржавай пазыкі мелі вялікі посьпех і паказалі высокую сьвядомасьць працоўных мас Беларусі і Меншчыны ў тым ліку. Усё-ж мы ня можам спыніцца на гэтых посьпехах, а павінны стала клапаціцца аб павялічэньні нашых сродкаў на будаўніцтва народнае гаспадаркі. Зьберажэньні і часова вольныя сродкі насельніцтва да гэтага часу яшчэ мала ўцягнуты ў дзяржаўны крэдыт, аб чым сьведчаць слабыя вынікі працы ашчадных кас. Да гэтага часу па Менскай акрузе касамі ахоплена толькі 26 проц. членаў саюзаў, а лік укладчыкаў-сялян складае толькі 1,8 проц. агульнага ліку сялянскіх гаспадарак.

Асноўнай прычынай слабога ўцягненьня ў ашчадныя касы працоўных мас зьяўляецца тое, што працоўныя не асазналі яшчэ і ня ведаюць дакладна значэньня для іх ашчадных кас.

Для шырокага растлумачэньня насельніцтву выгад і значэньня кас ашчаднасьці з 15 лютага да 15 сакавіка па ўсяму Саюзу будзе праводзіцца «двухтыднёвік ашчаднасьці».

Паказаны «двухтыднёвік ашчаднасьці», які ў Менскай акрузе будзе праводзіцца з I-Ш б. г., мае асноўнай мэтай набліжэньне ашчадных кас да шырокіх мас насельніцтва, укараненьні іх у быт рабочых і сялян і павялічэньне сродкаў на індустрыялізацыю краіны.

Кожны рубель у ашчаднай касе ўзмацняе тэмп нашага сацыялістычнага будаўніцтва і павялічвае магчымасьць найбольшага здавальненьня патрэб працоўных мас.

Ніводнага рабочага і служачага ў горадзе і ніводнага селяніна на вёсцы Меншчыны без ашчаднай кніжкі!

За шпаркае будаўніцтва новых фабрык і заводаў і індустрыялізацыю сельскай гаспадаркі!

Менскі Акругавы Выканаўчы Камітэт.

ПЭРСПЭКТЫВЫ РАЗЬВІЦЬЦЯ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧАЙ ПРАЦЫ У БССР

(З усебеларускага зьезду навуковых працаўнікоў).

Даклад на гэту тэму зрабіў прадстаўнік Галоўнавукі НКА БССР т. Некрашэвіч.

У сувязі са складаньнем 5-гадовых плянаў кардынальныя пытаньні зьяўляюцца: форма арганізацыі навукова-дасьледчай працы, сетка навукова-дасьледчых устаноў на 5 год, удзел у навукова-дасьледчай працы ВНУ і асьпірантура.

Устаноўка Галоўнавукі на навукова-дасьледчую працу ў цэлым скіравана да здавальненьня патрэб сацыялістычнага будаўніцтва. Асноўнымі тэмамі нашай навукова-дасьледчай працы павінна зьяўляцца дасьледваньне наступных праблем: індустрыя, сельская гаспадарка, прырода і вытворчыя сілы, народнае здароў'е і ахова працы, умацаваньне новых сацыялістычных форм гаспадарчага будаўніцтва, эканоміка, сацыялістычнае будаўніцтва, разьвіцьцё беларускай культуры і культуры нацыянальных меншасьцяй БССР.

Разгортваючы працу па гэтых тэмах, мы павінны ў першую чаргу сваімі дасьледамі абслугоўваюць БССР адпаведна бліжэйшым задачам гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, а таксама адпаведна нашым інтэлектуальным і матар'яльным рэсурсам.

Каб пры мінімуме затрат на навукова-дасьледчую працу атрымаць максымум яе эфэктыўнасьці, патрэбна правядзеньне суровай рацыяналізацыі гэтай працы і, у першую чаргу, устаноўкі арганізацыйных форм, сыстэмы навукова-дасьледчых устаноў БССР в яе невялікай тэрыторыяй і абмежаванымі фінансавымі рэсурсамі вымагае заснаваньня комплексных дасьледчых устаноў, якія змогуць ахапіць сабой усе патрэбныя для БССР дасьледы.

Адпаведна асноўным установкам Галоўнавукі па навукова-дасьледчую працу патрэбна яшчэ заснаваньне 2 комплексных устаноў—інстытуту прамысловасьці і адзінага мэдыцынскага інстытуту; апошні аб'яднае ўсе існуючыя інстытуты Наркамздраву. Такім чынам, БССР могуць задаволіць 4 асноўныя комплексныя ўстановы: Беларуская Акадэмія Навук, Інстытут імя Леніна, інстытут прамысловасьці і мэдыцынскі.

У складзе гэтых устаноў па 5-годцы разам з існуючымі будзе 11 спэцыяльных інстытутаў, 25 катэдр, 25 аддзелаў і 19 станцый, а ўсяго 80 асобных навукова-дасьледчых устаноў. На фінансаваньне гэтых устаноў і будаўніцтва па 5-годны мяркуецца адпусьціць 12.500.000 р.

Разам з тым навукова-дасьледчая праца ВНУ павінна быць узмоцнена і павінна насіць дапаможны характар да асноўнай працы навукова-дасьледчых устаноў.

Рацыяналізацыя працы патрабуе суровай пляновасьці, уніканьня паралелізму, ліквідацыі саўміншчальнасьці ў навукова-дасьледчай працы, павышэньня забясьпечаньня навуковых працаўнікоў і камандыровак. Павінна быць таксама ўзмоцнена работа на ідэалёгічным фронце навуковай працы і яе беларусізацыя. У навукова-дасьледчую працу павінны быць уцягнуты шырокія колы рабочых і сялян.

У галіне падрыхтоўкі маладых кадраў у БССР ёсьць значныя дасягненьні—зараз мы маем 129 асьпірантаў. Аднак, гэтую лічбу нельга прызнаць здавальняючаю, і лік асьпірантаў трэба будзе давесьці да 360 чалавек, на што патрэбна на 5 год да 2.000.000 руб.

Сучасны склад асьпірантуры в сацыяльнага боку нельга таксама прызнаць здавальняючым, для чаго ў далейшым асьпірантуру трэба камплектаваць з рабочых і сялян, павышаючы процант партыйцаў.

У заключэньне трэба сказаць, што на навукова-дасьледчую працу ў БССР у працягу 5 год прадбачыцца затраціць каля 23.000.000 руб., а па ўсяму СССР, па арыентыровачных падліках, звыш 1500 міліёнаў рублёў.

У спрэчках па дакладу т. Некрашэвіча, галоўным чынам, указвалася, што ўстаноўка Галоўнавукі на навукова-дасьледчую працу, на арганізацыйныя формы яе і разгортваньне—правільная. Асабліва падкрэсьлівалася правільнасьць узятай Галоўнавукай лініі на ўзмацненьне навукова-дасьледчай працы ВНУ Беларусі. Зазначалі дэлегаты і на тое, што запрапанаваная Галоўнавукай лічба асыгнаваньняў на нав.-дасьледчую працу ў ВНУ у суме каля 500.000 руб. зьяўляецца недастатковай.

ХРОНІКА.

ДА МІЖНАРОДНАГА ЖАНОЧАГА ДНЮ.

Менская інспэкцыя аховы здароўя вызначыла шэраг мерапрыёмстваў для адзначэньня міжнароднага дню жанчыны. Так, да 8 сакавіка дастасоўваецца адчыненьне новых дзіцячых ясьляў, будзе таксама праведзена абсьледваньне ўсіх дзіцячых устаноў і праверка ахвату бытавымі ўстановамі работніц і сялянак.

8 сакавіка адбудзецца ўрачыстае адчыненьне менскіх дзіцячых ясьляў № 25, якія пашыраны на 25 месцаў. Па ўсіх дзіцячых ясьлях будуць наладжаны вечары в дакладамі аб 8 сакавіка в удзелам прымацаваных дэлегатаў і бацькоў. Для дзяцей гэтых устаноў будуць наладжаны ранішнікі і палепшана харчаваньне. У дамох дзіцяці таксама будуць праведзены ўрачыстыя вечары для пэрсаналу, і будзе палепшана харчаваньне.

Для матак-адзіночак праз Біржу Працы ў дзень жаночага сьвята будуць выдадзены бясплатныя абеды, а таксама талоны ў лазьню і мыла.

Ідзе падрыхтоўка да Міжнароднага Дню жанчын і па райёнах Менскай акругі. 8 сакавіка будуць урачыста адчынены дзіцячыя ясьлі ў Пухавіцкім і Койданаўскім райёнах; ідзе падрыхтоўка да адчыненьня дзіцячых ясьляў у Бягомльскім і Заслаўскім райёнах. Па ўсіх райённых консультацыях для жанчын будуць праводзіцца даклады, а таксама конкурс на лепшае дзіця.

Інспэкцыя аховы здароўя мае правесьці курсы сялянак; курсамі будзе ахоплена да 100 жанчын. У Грэскім, Самахвалавіцкім і Плешчаніцкім райёнах 8 сакавіка адбудзецца ўрачыстае адчыненьне дзіцячых консультацый.

Новы цэнтр. савет сэкцыі навуковых працаўнікоў.

У апошні дзень працы IУ усебеларускага зьезду навуковых працаўнікоў былі праведзены перавыбары цэнтральнага савету сэкцыі навуковых працаўнікоў БССР.

У цэнтральны савет абрана 25 членаў і 4 кандыдаты. На першым пасяджэньні савету абрана бюро ў складзе 11 членаў і 3 кандыдатаў. У бюро абраны—праф. Вальфсон, Гарэцкі, Усьпенскі, Панкевіч, Казак, Друшыц і інш. Старшынёй абраны прафэсар Вальфсон, адказным сэкратаром—т. Казак.

На будаўніцтве трамваю.

Торгстрой у бліжэйшыя дні распачынае работу на пераабсталяваньню камеры высокага напружаньня для пашырэньня Менскай электрастанцыі. У гэтым будынку будзе абсталавана падстанцыя для абслугоўваньня энэргіяй трамваю. Электрычная падстанцыя будзе гатова ў маі месяцы.

Ідзе таксама падрыхтоўка для пачатку пабудовы трамвайнага парку. На месце пабудовы падвозіцца цэгла, каменьні, цэмант, рэйкі і іншыя дапаможныя матар'ялы. Матар'ялы ўжо падвезены амаль поўнасьцю.

Пабудова фасфарытных млыноў.

Вясной бягучага году будзе пушчан у ход новы фасфарытны млын каля гор. Амсьціслаўля. Фасфарытны млын будзе пераапрацоўваць у год 150—200 тысяч пудоў фасфарытнай мукі. Апрача гэтага, кіраўніцтва будаўніцтвам цэмэнтных і фасфарытных прадпрыёмстваў ВСНГБ прыступае сёлета да пабудовы і абсталяваньня такога-ж млыну каля г. Клімавічы.

Пабудова цэмантнага заводу.

ВСНГБ прыступае ў надыходзячым будаўнічым сэзоне да пабудовы буйнага цэмантнага заводу ў райёне м-ка Крычава, Магілёўскай акругі. Пабудова заводу будзе весьціся з такім разьлікам, каб закончыць яе да 1931 г.

Кошт пабудовы заводу з поўным абсталяваньнем будзе каштаваць каля 7 міліёнаў руб. Вытворчасьць заводу—да міліёна бочак цэмэнту ў год.

Пабудова новых крахмальных заводаў.

У надыходзячым будаўнічым сэзоне Белсельтрэст прыступае да пабудовы новага буйнага крахмальнага заводу ў савецкай гаспадарцы «Лівава», Мазырскай акругі, з перапрацоўкай 300.000 пуд. бульбы за сэзон. Завод будзе мэханізаваны. Апроч гэтага будзе закончана пабудова буйнага крахмальнага заводу ў савгасе «Харопуць, Гомельскай акругі.

Слаба загатаўляецца валакно.

Яшчэ ў мінулым годзе пры загатоўцы валакна ўзьнікалі паміж загатоўцамі значныя непаразуменьні, канкурэнцыя. На гэта ў свой час рэагавалі мясцовы друк, і Наркамгандаль БССР «абяцаў» прыняць рашучыя меры да вынішчэньня ўсіх ненармальнасьцяй і паставіць справу загатоўкі валакна так, каб ня было перавагі ў аднаго загатоўцы перад другім.

Нажаль, сёлета гэтыя ненармальнасьці ня толькі ня вынішчаны, а нават наадварот—у розных пунктах БССР ідзе шалёная канкурэнцыя, і адзін загатоўца мае нейкія асаблівыя правы, асаблівыя ільготы перад другім.

Вось што паведамляе Гомельскае Аддзяленьне Белдзяржгандлю:

«Загатоўка валакна магла-б быць пасьпяховай, калі-б кааперацыя выканала дырэктывы ўрадавых органаў аб прэміраваньні здатчыкаў валакна прамтаварамі і хлебам. Шмат дакументаў, якія ў нас ёсьць, пацьвярджаюць адмову нізавой кааперацыі ў прэміраваньні нашых здатчыкаў лёну прамтаварамі. Аднак, кааперацыя ў значнай колькасьці выдае прамтавары тым селянам і нарабейнікам, якія здаюць валакно ім».

Такія данясеньні ёсьць і в цэлага шэрагу пунктаў Белдзяржгандлю; скардзяцца, што іх здатчыкам валакна не выдаюць вызначаных урадам прамтавараў і хлеба.

Ясна, што пры гэткіх умовах Белдзяржгандаль, на які ўскладзена заданьне па экспарту валакна, а таксама на дастаўцы яго для беларускай прамысловасьці, ня зможа выканаць гэтага заданьня.

А між тым заданьне па экспарту валакна навіна быць выканана абавязкова; другі квартал у гэтых адносінах зьяўляецца рашаючым, і калі ён будзе прапушчан, дык нагнаць ужо ня будзе ніякай магчымасьці.

Неабходна Наркамгандлю БССР, для якога ўсе загатоўцы павінны быць роўнымі, узяць самы цьвёрды і суровы курс на поўнае вынішчэньне ненармальнасьцяй, якія ствараюцца пры загатоўцы валакна. Ёсьць цэлы шэраг паведамленьняў, што паміж агентамі кааперацыі і Белдзяржгандлю ідуць увесь час «бойкі»: пераманьваюць супрацоўнікаў, робяць усё, каб «вырваць кавалачак лёну» адзін у другога.

Пара ўжо спыніць такія агідныя справы на ільняным рынку, пара ўтварыць такія ўмовы, каб усе маглі выконваць дырэктывы ўрадавых органаў.

Трэба спыніць незаконны тавараабмен, які толькі ўносіць блытаньне ў справу загатовак.

Л. Манін.

Трэба палепшыць гарадзкое садоўніцтва.

У Беларусі садоўніцтва, асабліва плодаводзтва мае вялізарнае эканамічнае значэньне і дае насельніцтву гарадоў значную карысьць. Апошняя была-б яшчэ большай, каб за садамі быў належны дагляд.

Аб гэтакім даглядзе насельніцтва аднак мала клапоціцца, часткай па нявіданьню мэтадаў і спосабаў, а часткай па немагчымасьці кожнаму пасобнаму садаўласьніку мець для гэтага ўсё неабходнае, як пілы, нажы, гэкаторы, шчоткі, рыдлёўкі, апрыскваецелі і інш. садовыя прылады.

Усё гэта пад моц буйнаму прадпрыёмству, альбо грамадзкім арганізацыям. Але мы бачым, што нават камгаскія сады прадстаўляюць в сябе, як кажуць «мерзость запустения», у той час, як яны павінны быць узорам вядзеньня садовай гаспадаркі, так і ня варта было-б іх трымаць пад камгасам.

Ініцыятыва ўпарадкаваньня гарадзкога садоўніцтва павінна выходзіць ад гарсаветаў, якія нарэшце праз выканком павінны ўзяць на сябе абслугоўваньне ўсіх садоў у горадзе.

Абслугоўваньне ўсіх садоў у горадзе адной установай неабходна яшчэ і затым, каб не распаўсюджваць заразы і на тыя вакалічныя сады, дзе дагляд за імі ўжываецца, бо калі маецца ў горадзе хоць адно гняздо шкодніцтва, дык будуць ад яго цярпець усе сады і заразагэтая вельмі і лятуча і аднаму гаспадару няма магчымасьці з ёю змагацца.

Ажыцьцёвіць гэтае мерапрыёмства заўсёды магчыма, шляхам самаабкладаньня, якое па прыкладу вёсак дасьць для гэтага неабходныя сродкі, а садаўласьнікі, я упэўнен, за гэта будуць толькі дзякаваць.

Вось у працягу зімы гарсаветам і ня шкодзіла-б абмеркаваць гэтае пытаньне і падрыхтаваць яго хоць да вясны.

Я. С-ч.

СУД.

Справа контр-рэвалюцыйнае тройкі*).

Усе 17 сьведак, якія прайшлі перад судом на працэсе, яскрава даказалі, што дзейнасьць падсудных на ёсьць справа выпадковага характару, што яе ні ў якім разе нельга тлумачыць простым хуліганствам, а што гэта справа была ўважліва прадумана падсудными і мела свае контр-рэвалюцыйныя мэты.

Адсюль яна становіцца тое, чаму Алесь Нікалаевіч у лісьце сваім да дому з пад арышту пісаў, называючы сабе «правадыром селянскага паўстаньня»; адсюль яна, чаму пан Лагіза хацеў затушыць гэтую справу, радзячы Андрэю Нікалаевічу напісаць заяву на сэкратара партыйнае ячэйкі ў ДПУ.

Праведзенае судовае сьледзтва поўнасьцю пацьвердзіла абвінавачваньне, якое высунута супроць гэтае тройкі. І пракуратура ачаніла дзейньне падсудных, як контр-рэвалюцыйную справу.

У сваёй прамове памоцнік пракурора Рэспублікі т. Курачкін казаў: той, хто гаворыць аб всэраўскай селянскай свабодзе, той ідзе супроць дыктатуры пралетарыяту супроць саюзу пралетарыяту з селянствам, той падрывае ўстрой савецкай улады. Гэтая справа,—гаворыць далей пракурор—мае асаблівае важнае значэньне ў вэрыад абвастрэньня клясавай барацьбы на вёсцы, а таму ўсялякая контр-рэвалюцыйная спроба павінна быць зьнішчана ў корані.

Для галоўнага падсуднага Нікалаевіча Андрэя пракурор патрабуе вышэйшае меры сацыяльнае абароны—расстрэлу; для Алеся Нікалаевіча—пазбаўленьня волі да 7-мі гадоў з высылкаю на поўнач пасьля адбыцьця кары; для падсуднага Лагізы пракурор патрабуе пазбаўленьня волі да 6-ці гадоў з высылкаю за межы Беларусі.

Прысуд будзе заўтра.

*) Гл. «Сав. Бел. № № 39 і 40.

КІНО.

„АВАДЗЕНЬ".

(Кіно «Культура».)

Вядомы твор Войніча—„Овод" прайшоў ужо ў тэатры, ідзе на экране. Гэта тлумачыцца вялікаю сацыяльнаю і мастацкаю вартасьцю вобраза, створанага Войнічам. Але гэты вобраз мае два бакі: «Авадзень»—як змагар, як сацыяльны тып, і «Авадзень"—як інтэлект, як псыхалёгічны тып. І паказаць „Авадня" на экране—гэта значыць вывяўць гэтыя абодны бакі аднаго і таго-ж вобразу, нават аддаючы перавагу сацыяльнаму боку, бо магчымасьці кіно—вельмі шырокія.

Між тым, пастаноўшчыкі в дзяржкінпрому Грузіі толькі навалову справіліся з гэтаю задачаю. Удала паказаны псыхалёгічныя перажываньні гэроя, але зусім не паказан сацыяльны тып, змаганьне за справу працоўных мас. А гэта галоўнае ў паказе такой рэчы, як „Авадзень". Другімі словамі—тэатральная пастаноўка цалкам перанесена на экран, без дадатковага ўласьцівага кіно, шырокага афармленьня рэчы.

Зусім іншая справа з паказам асабістых перажываньняў „Авадня", Джэмы і кардынала. Роля „Авадня" выканана дасканала. Артыст вельмі добра ўладае мімікаю, сваёю ігрою артыст стварае жывога чалавека, глыбока эмацыянальны вобраз. У гэтым ёсьць зусім новае дасягненьне Грузкіно. Але часткова гэта дасканалая ігра артыста зьяўляецца мінусам для фільму. Артыст «заігрывае» усё іншае. Так, прыкладам, мамэнты антырэлігійнасьці, выяўленьня шмат лепш за змаганьне проці ўлады, ня робяць належнага ўражаньня. Тая моцная зарадка, якую дае крык кардынала—«Вырвацца»—прападае марна.

Л.

АБВЯШЧЭНЬНЕ.

Ніжэйпералічаныя таварышы—члены Цэнтральнай Выбарчай Камісіі і выяжджаўшыя на месцы для ўдзелу ў перавыбарах—павінны зьявіцца ў пятніцу, 22-га лютага, а 6 гадзіне ўвечары на нараду, якая адбудзецца ў зале пасяджэньняў Прэзыдыуму ЦВК. На нарадну дню—інфармацыі выяжджаўшых таварышоў.

Гантман—ЦК КП(б)Б, Рыжоў—ЦСПСБ, Крамер—ЦК КП(б)Б, Крохмаль—пайсковы, Сташэўскі—НКЮ, Бейлін—ЦК КП(б)Б, Каплан—ЦСПСБ, Арлоўскі—рабочы зав. „Камунар", Стасевіч—ЦК КП(б)Б, Унароўскі—ЦК КП(б)Б, Бучукас—ЦК КП(б)Б, Думс—ЦК КП(б)Б, Ляўкоў—ЦК КП(б)Б, Гэйне—СНК БССР, Кузак—ЦСПСБ, Бэйк—НК Працы, Захарава—НК Працы, Шычко—НК Землар., Васьковіч—НК Землар., Тамковіч—НК Землар., Бутар—НКЮ, Кардашэнка—НКФ, Сьпевакюк—НКФ, Вінаградаў—НК РСІ, Жукаў—НК РСІ, Ваврженок—ЦК КП(б)Б, Жарын НК Сац. Заб., Белікі—НК Асьветы, Шастакоў—НК Асьветы, Прафрансаў—ЦСУ, Чарнушэвіч—Дзяржстр., Вайтэнкаў—ЦП с.-г. рабочых, Платун—ЦП Працасьветы, Лукевіч—Белнайгандз., Наўлянскі—Белкаапсаюз, Шыціла—Рэд. «Рабочы», Дубіна—Белсельсаюз, Яршоў—Дзяржбанк, Фрыд—Усекабанк, Васкабойнікаў—Камунбанк, Галавач—ЦК ЛКСМБ, Сьпяжаў—ЦК ЛКСМБ, Сьмірноў—Калгасцэнтр, Мачульскі—Дзяржсьпірт, Сапун—ЦК КП(б)Б, Папова—ЦП Прац. Маст., Граёўская—ПК Аховы Здароўя, Дземідовіч—НК Асьветы, Меерзон—ЦК КП(б)Б, Альперовіч—ЦРК, Коцікаў—вайсковы, Барсукоў—вайсковы, Зайпаў—вайсковы, Масальскі—ЦВК, Тафеенка—НК Земляробства, Самахвалава—НКФ, Каданаў—Дзяржстрах, Шаўчэнка—вайсковы, Гінц—НК Аховы Здароўя, Верас—НК РСІ, Елісеў—НК Земляроб., Цітоў—НК Сац. Заб., Перавозьнікаў—НКФ, Палозьнік—Белсельтрэст, Новікаў—НКЮ, Дайнека—НК Асьв., Пятроўская—НК Гандлю, Доўгазапава—НКЗ, Попель—БДУ, Пятук—Лесбел, Рэкьцін, Шкільбер, Мэдынек—ВСНГ, Тамашунас—вайсковы, Шокін—вайсковы, Кулікоў—вайсковы, Хоцін—вайсковы, Крутоўскі—вайсковы, Кізік—вайсковы.

БІБЛІАГРАФІЯ.

«УЗВЫШША» № 1, тыраж 2000, стар. 126. Менск, 1929 год, ц. 80 к.

1 № «Узвышша», які выйшаў нядаўна з друку, сьведчыць аб тым, што некаторыя традыцыйныя „выбрыкі" дыскусій папярэдніх гадоў знайшлі поўнае ў ім адбіцьцё. Няхай чытач даруе нам, але дазволіць зьвярнуцца адразу да аддзелу кніганісу, у якім знайшлі прытулак сброд зусім слушных рэцэнзій і дзьве рэцэнзіі Куцэвіча і Васілені.

Аб здольнасьцях першага крытыка нам прыйшлося даведацца ўжо па папярэднему нумару, але задзёрысты тон крытычнага мэстры ў нападзе «Літаратурная хлестакоўшчына» дайшоў да кульмінацыйнага пункту. Рэцэнзуючы кніжку Тодара Глыбоцкага, паважаны крытык сам ня ўнікае ў крытыцы „хлестакоўшчыны" і ў канцы рэцэнзіі „міла" (зусім, як Хлестакоў!) «прашчэцка» з чытачом. А ўсьлед за ім новасьпечаны крытык Васіленя (?) хае „за мілую душу" вершы Моркаўкі, аб якім шэраг крытыкаў нашага часу (Жылуновіч, Максім Гарэцкі і шэраг рэцэнзэнтаў) адзываліся дадатна. Ці ня ёсьць рэцэнзія таварыша Васілені варыянтам «моністычнага» погляду рэдакцыі на беларускіх пісьменьнікаў? Дзіўна бачыць ва „Узвышшы" гэткія рэчы, бо часопіс гэная дбае ўвесь час аб культуры мастацтва... Але, відаць, словы словамі, бо што возьмеш з таго самага гогалеўскага Хлестакова? Але далей. Крытычны разьдзел часопісі трымае ў сябе тры артыкулы, апроч якіх ёсьць у «Культуры мовы» цікавы і сур'ёзны артыкул Дубоўкі—«Лацінка ці кірыліца». Асабліва слушным зьяўляецца артыкул тав. Дрэйзіна «Франц Шубэрт» таму, што пытаньні музыкі асьвятляюцца ў беларускай літаратуры вельмі рэдка, і рэдакцыя „Узвышша" шмат працуе ў справе популярызацыі музыкі. Артыкул і адпавядае патрэбам беларускага чытача. Артыкул Краўцы сьведчыць аб тым, што таварышы в „Узвышша" лачаві брацца за розум і выходзіць в «Парнаса», што трэба толькі вітаць. Артыкул Яз. Пушчы падае старыя думкі, якія так ці інакш выказваліся пасобнымі таварышамі ў розных нападках і пахне крыху Бабарыкам, а вось ягоныя (Пушчы) вершы „Сьнежаньская сьвежасьць" далёкі ад тэорыі і выходзіць, як кажа сам Пушча: «Падманіў я сам сабе» (ст. 22). Гэтыя вершы гучаць ужо даўно-чутым: містычныя вобразы захіпаюць сэнс, дзе ёсьць такія „перлы":

«Юла ў полі ўзьвялася»...
«Воўчы зуб аб зуб заляскаў»...
«Вось і крыж усё той самы, нават
в тымжа і Хрыстом»... і г. д. і г. д.

Яшчэ з павазі, зьмешчанай у нумары, вызначаецца рэч Уладзіміра Дубоўкі «Пярэсты Букет», якая зьяўляецца пострах гіровіяй у адносінах да літаратуры, наогул, і самаго сябе, у прыватнасьці...

Рэч цікавая, хоць і залішне цынічная.

Краціна ў апошніх рачах не пазбаўлена гумару, але гумар гэты... крыху грубы і зусім не пасуе агульнай лініі часопісі—барацьбы за культуру мастацтва. Тры сатыры Кранівы сьведчаць аб некаторых фармальных дасягненьнях.

Вершы Хадыкі і Гдэбкі—звычайныя для гэтых паэтаў, трэба толькі адпатаваць, што арыентацыя першага на эпігонаў містычнай паэзіі, на нашу думку, зусім не патрэбная.

Прозаічны матар'ял часопісі складаецца з прыгожага ўрыўку „Местачкоўцы" Кузьмы Чорнага, у якім назіраецца вялізарны поступ гэтага прозаіка наперад. Пажадаем хутчэйшага друкаваньня раману «Вецер і пыл», які, калі можна мяркаваць па друкаваных кавалках, абяцае быць цікавым. Апавяданьне „Мацеліца" Максіма Лужаніна зьяўляецца звычайнай для яго рэчу. Трэба толькі адмовіцца ад экстравагантнай трагічнасьці і рамантычнасьці.

П'еса «Воўчыя ночы» Шашкевіча добрая ўжо тым, што надзвычайна простая і цікавая для сёньняшняга чытача. Шкада толькі, што п'еса друкуецца кавалкамі.

Агульныя вывікі. Часопісі трэ' адмовіцца ад «выбрыкаў» літаратурных хлестакоўных, трэ' пільней прыглядацца да твораў (асабліва вершаў) сваіх супрацоўнікаў, трэ' іх памылкі не захіпаць, а сур'ёзна і ўважліва выкрываць для хутчэйшага скону. Толькі такім шляхам часопісь зробіць вартую справу, якую, калі хочаце, „угледзець вазі і народы".

Выдадзена часопісь надзвычайна прыгожа і старанна, але адной пекнаты для беларускай культуры мала...

Барыс Мікуліч.

Апавяшчэньні.

ПЭДГАБІНЭТ.

У чацьвер, 21 лютага, роўна а 7-й гадзіне ўвечары будзе працягвацца праца ў падсэкцыях „грамадзка-карыснай працы школы".

Павінны зьявіцца ўсе вылучаныя школамі ў падсэкцыі таварышы.

Запрашаюцца і іншыя настаўнікі школ г. Менску.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, 21-2, роўна а 8-й гадз. увечары адбудзецца агульны сход членаў саюзу працасьветы гор. Менску.

На абмеркаваньне дню—даклад т. Платуна аб 8-м усебеларускім зьезьдзе саюзу працасьветы.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

28 ЛЮТАГА Ў ВАРШАВЕ

ПАЎТОРНА БУДЗЕ СЛУХАЦЦА

СПРАВА

Беларускай Грамады

ЧЫТАЙЦЕ:

ЗАПРОСЫ БЕЛОРУССКИХ ПОСЛОВ В ПОЛЬСКИЙ СЕЙМ 1922—1927 г. г. СБОРНИК ДОКУМЕНТОВ о польских насилиях, мучениях и издевательствах над крестьянами и рабочими Западной Белоруссии Стар. 530. Цана 1 р. 25 к.

Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада ЗЬМЕСТ: Гістарычная спраўка. Зах. Беларусь—яе тэрыторыя і жыхарства. Вайна 1914—1918 г. г. і высяленьне. Калёнізацыя Зах. Беларусі палякамі. Школьна-асьветны рух Зах. Беларусі. Беларуская Салянска-Работніцкая Грамада. АДОЗВА. Стар. 55. Цана 25 кап.

Белорусская Селянска-Работницкая Громада Перевод с белорусского языка. СТР. 54. ЦЕНА 25

У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ: „ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ" БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР. ЧАЦЬВЕР, 21-ГА ЛЮТАГА. МЕНШВЭЮ КАВАЛЬ-ВАЯВОДА. Пачатак а 8 гадз. ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». З аўторка 19 лютага мастацкі фільм „ОВАД". Вытворчасьці Дзяржкінпромгрузіі.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка 19 лютага. „МІЛІЁН ЗА ВЯЧЭРУ" у 8 частках. З удзелам ОСІ ОСВАЛЬД.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. З аўторка „Косая линия" у 6 частках.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». (Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»). З аўторка 1. „ХВЕДЗЬКІНА ПРАЎДА" 2. Па Азіі і сярэдняму Каўказу. пачатак у 3 з пал. і 5 гадз.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА,

што сельска-гаспадарчая арцель «СПАРТАК», якая знаходзіцца ў м. Юсьціянава, Дрысенскага райёну, Полацкай акругі,

ЛІКВІДУЕЦЦА.

Прэтэнзіі да арцелі прымаюцца да 25 лютага г. году ў ліквідацыйнай камісіі—г. Дрыса. Ліквідкамісія.

ЗГУБЛЕНЫ:

Асабова-вайсковая кніжка Вольфмана І. Х. выд. Мазырск. АВК, кв. 11 п.

Вучотна-конская карт. Паўлюшчыка Я., выд. Капыльскім РВК, кв. 12 п.

Адбітак бальнічнага лістка Піскунава Я. В., выд. Мазырскай страхкасай, кв. 13 п.

Асабовае пасьведчаньне за № 153 Каплана А., выд. Песачанскім с.-сав., кв. 14 п.

Сяброўская кніжка № 14904 Халецкага Ц. Е., выд. мясцкомам № 18, ст. Слаўнае М.БВ чыгункі кв. 15 п.

— Паявая кніжка № 736 Драбніца Ю. Ф., выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.

— Кніжка № 732 Місюка В. Ф., выд. Калінкавіцк. с-гасп. т-вам.

— Кніжка Левіна З. З., выд. Калінкавіцк. с-гасп. т-вам.

— Кніжка № 1200 Дулуба С. П., выд. Калінкавіцк. с-гасп. т-вам.

— Партбілет, выд. Бабр. 5 корпусам, 2) білет КСМ № 10590, выд. Калінкав. РККСМ, 3) сяброўскі білет, выд. Калінкавіцк. саюзам савгандзеля., 4) вучотная кніжка, выд. 19 стр. палкам у г. Бабруйску на імя Карнілеўца А. М.

Галоўлітбел 595. Менск, дзяржаўная друкарня.